Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

27 ВЕРАСНЯ 2023 г.
СЕРАДА
№ 187 (30067)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ТУРЫЗМ, АПК, РАЗВІЦЦЁ ТЭРЫТОРЫЙ

ЯКІЯ ПРЫШЧЭПКІ ВАРТА ЗРАБІЦЬ ВОСЕННЮ?

12

ЦЫТАТА ДНЯ

Алег ШВЕЦ,
першы намеснік міністра архітэктуры і будаўніцтва:

«Будаўнічая галіна справілася з усімі выклікамі, якія стаялі перад ёй. Тэмпы экспарту за апошнія гады не апускаліся ніжэй за 100 працэнтаў. У прыватнасці, экспарт будаўнічых тавараў у Расію з пачатку года вырас на 24 працэнты — не толькі ў грашовым выражэнні, але і ў аб'ёме. Мы таксама адкрываем новыя краіны і рынкі. Можна сказаць, што ўсе негатыўныя тэндэнцыі мы пераадолелі і вырашылі ўсе пытанні. Мы ідзём наперад — развіваемся, забяспечваем кааперацыю, унутраны рынак, пастаўкі на экспарт. Беларусь пастаўляе прадукцыю і паслугі ў Казахстан, Кыргызстан, Таджыкістан, Кітай. Геаграфія пашыраецца. Ужо ёсць новыя напрацоўкі».

Шыкоўныя краскі восені

Фота БелТА.

У Цэнтральным батанічным садзе Нацыянальнай акадэміі навук — час шыкоўных калераў і кветак: красуюць хрызантэмы і вяргіні. Кветкі сапраўды шыкоўныя, бо растуць у доглядзе, пад апекай дасведчаных спецыялістаў. Напрыклад, Вольга ДУБРОВА, навуковы супрацоўнік лабараторыі інтрадукцыі і селекцыі арнаментальных раслін, курыруе калекцыю вяргінь.

КАРАТКА

- **Бясплатныя прававыя кансультацыі да Дня пажылых людзей пройдуць у Беларусі.**
- Беларусь далучылася да папраўкі да Канвенцыі аб фізічнай абароне ядзернага матэрыялу.
- **У Беларусі намалочана больш за 246 тыс. тон зерня кукурузы.**
- Аб'ём экспарту турыстычных паслуг за сем месяцаў перавысіў $116 млн.
- **Палова экспарту арганізацый «Беллеспапарапрама» прыпадае на Расію.**

ISSN 1990 — 763X

Грыбны «квэст»

Што варта прадугледзець, ідучы ў лес?

Ціхае паляванне — у самым разгары. А значыць, усё больш становіцца грыбнікоў, якія не могуць самастойна выбрацца з лесу і вярнуцца дахаты. Прычым губляюцца не толькі грыбнікі-навічкі, а і тыя, хто збірае лясныя дары на працягу дзясяткаў гадоў. І гэта звязана не толькі з тым, што лес мяняецца, — зарастаюць даўно знаёмыя сцяжынкі, а добра вядомы шлях перакрывае паваленае дрэва. Нярэдка грыбнікі пераацэньваюць свае сілы і ў пошуках лісічак ды баравікоў пераадольваюць вялікія адлегласці. Вярнуцца назад не дазваляе здароўе. Іншыя, упэўненыя ў сваіх сілах, будучы ў лесе, не звяртаюць увагі на арыенціры — у выніку забрыдаюць у незнаёмыя месцы.

СТАР. 3

Вялікі перапынак

СТАЦЬ ФЕРЗЁМ У СВАЁЙ ПРАФЕСІІ

Ва ўдзельнікаў фестывалю «Педагагічны дэбют» свая формула поспеху

Мноства пытанняў паўстае перад кожным маладым педагогам. З чаго пачаць? Што сказаць вучням ці выхаванцам пры першай сустрэчы? Як выбудаваць узаемаадносіны з дзіцячым калектывам і знайсці падыход да кожнага? Як зрабіць бацькоў дзяцей сваімі саюзнікамі? Як прызвычаіцца да новай сваёй ролі? Яны баяцца, што вучні не будуць успрымаць іх усур'ёз, баяцца аказацца з дзецьмі на розных хвалях, не ведаюць, як прымуць іх старэйшыя калегі.

СТАР. 5

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«КАЛІ ЛЕНІНГРАДЦЫ І БЕЛАРУСЫ ПАЧЫНАЮЦЬ НЕЙКУЮ СПРАВУ — ЗАЎСЁДЫ ІМКНУЦЦА ДАВЕСЦІ ЯЕ ДА ЗАВЯРШЭННЯ З НАЙЛЕПШЫМ ВЫНІКАМ»

Падрабязнасці сустрэчы Прэзідэнта і губернатара Ленінградскай вобласці

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з губернатарам Ленінградскай вобласці Аляксандрам Драздзенкам. Гэтымі днямі праходзіць візіт дэлегацыі Ленінградскай вобласці ў Беларусь. Аляксандр Драздзенка ў статусе губернатара наведвае нашу краіну ўжо шосты раз. А ў 2023 годзе гэта ўжо яго другі візіт у Беларусь, летам ён наведваў Брэсцкую вобласць.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што шчыра рады вітаць гасцей на беларускай зямлі. «Ёсць аб чым пагаварыць. Калі ўжо вельмі шчыра, то мы б вельмі хацелі зрабіць у Расіі перш за ўсё стаўку на ваш рэгіён у супрацоўніцтве», — падкрэсліў беларускі лідар. Ён адзначыў, што з Санкт-Пецярбургам і Ленінградскай вобласцю ў Беларусі ўзорна-паказальныя адносіны. Але, па яго словах, гэтыя адносіны павінны мець большую эфектыўнасць.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ў беларусаў і ленінградцаў разуменне аб далейшых шляхах развіцця аднолькавае і планаванне вынікаў, погляды ідэнтычныя. «Калі ленінградцы і беларусы пачынаюць нейкую справу — заўсёды імкнуцца давесці яе да лагічнага завяршэння і з найлепшым вынікам», — канстатаваў ён.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што падчас папярэдняй сустрэчы ў лістападзе 2022 года была вызначана мэта — выйсці на запаветны мільярд у гандлі. Для гэтага ў гадавым вылічэнні аб'ёмы паставак трэба нарасціць на 20 працэнтаў. «Мяркую, выканальная задача ў цяперашняй сітуацыі, і мільярдам мы сапраўды не будзем абмяжоўвацца. Гэта толькі ўмоўны арыенцір для нас», — сказаў ён.

«Мы цяпер будзем больш глядзець на сябе»

Прэзідэнт згадаў адно з выступленняў Аляксандра Драздзенкі, дзе той адзначаў, што традыцыйныя перавагі Ленінградскага рэгіёна, які мяжуе з Еўрасаюзам, сталі з 2022 года фактарамі рызыкі. «Дзякуй богу, нам гэта вельмі выгадна, і Расіі таксама. Мы цяпер будзем больш глядзець на сябе і думаць, як нам развівацца далей», — заўважыў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў панядзелак правёў тэлефонную размову са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным. Па яго словах, кіраўнікі дзяржаў абмеркавалі два праекты, якія плануюць падрабязна разгледзець у кастрычніку ў Кыргызстане ў рамках пасяджэння кіраўнікоў дзяржаў — краін СНД. У прыватнасці, па словах Аляксандра Лукашэнкі, падчас тэлефоннай размовы прэзідэнты абмеркавалі сумеснае будаўніцтва самалётаў невялікай умяшчальнасці, якія вельмі запатрабаваны і патрэбны ў Расійскай Федэрацыі. У Беларусі ёсць адпаведныя кампетэнцыі, і Уладзімір Пуцін прапанаваў гэты самалёт пабудаваць сумесна, расказаў беларускі лідар. Таксама гаворка ішла аб больш актыўным асваенні вытворчасці кампанентаў для ІЛ-96 і абслугоўванні гэтых самалётаў у Беларусі. «Мы гэта можам зрабіць, гэта вельмі вялікі кавалак работы», — дадаў беларускі лідар.

Другое пытанне, абмеркаванае прэзідэнтамі, — будаўніцтва другой чыгуначнай веткі з Беларусі да Ленінграда, каб была магчымасць перакідваць большы аб'ём беларускіх грузаў у балтыйскія парты і адтуль працаваць на ўвесь свет. «Вы разумееце, для нас гэта вельмі важна, мы займаемся будаўніцтвам там партовай інфраструктуры. Але вузкае месца ў нас — чыгунка», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Перспектывы рэалізацыі праектаў, паводле слоў Прэзідэнта, ужо абмяркоўваліся з расійскімі ведамствамі, па іх падрыхтаваны пакет неабходных дакументаў, матэрыялаў, якія будуць перададзены кіраўніку расійскай дзяржавы.

«Вось толькі два прыклады з кароткай размовы. Гэта нашы сумесныя мерапрыемствы, якія мы можам рэалізаваць. А калі б Аляксандр Юр'евіч па-ранейшаму арыентаваўся на суседзяў, на Еўрасаюз, то мы б гэтымі пытаннямі яшчэ не займаліся. Так што не бывае нейкіх аднабаковых выгад і ўдач», — сказаў беларускі лідар. Па яго меркаванні, праблемы, якія сёння ёсць, Беларусь і Ленінградская вобласць адолеюць.

«Лічу, ленінградцы пры падтрымцы беларусаў паспяхова спраўляюцца з праблемай. Тэмпы развіцця эканомікі — пераканаўчае таму пацвярджэнне», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Выкарыстоўваць моцныя бакі адзін аднаго

Прэзідэнт заўважыў, што з дапамогай калег з Ленінградскай вобласці беларускі бок пераарыентаваў лагістыку, і беларускія вытворцы зноў маюць магчымасці гандляваць у Азіі, Лацінскай Амерыцы, Блізкім Усходзе і Афрыцы. Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што гэты напрамак будзе ўмацоўвацца.

«Для многіх заходніх палітыкаў стала сапраўдным адкрыццём, што свет значна шырэйшы за іх вузкія ўяўленні. Як звычайна, вырашылі па-руску: давай у бойку ўцягнемся, а там будзе відаць. Аказалася, калі не рускія, то і не атрымаецца», — звярнуў увагу беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што дзякуючы прамкааперацыі Беларусі і Ленінградскай вобласці ўдалося максімальна эфектыўна выкарыстоўваць моцныя бакі адзін аднаго для дасягнення тэхналагічнага суверэнітэту. Па яго словах, гэта дазволіць не толькі даць адказ на любыя спробы ціску Захаду, але і стварыць новае, здаровае канкурэнтнае асяроддзе ўнутры Саюзнай дзяржавы. Аляксандр Лукашэнка прывёў просты прыклад: «Нягледзячы на магутнае развіццё АПК у Беларусі і Ленінградскай вобласці (мы заўсёды паглядалі адзін на аднаго, бачачы ў гэтым канкурэнта нейкага), мы паспяхова знаходзім напрамкі, дзе можам адзін аднаго падтрымаць і за кошт гэтага дабаўляць у адносінах у сферы сельскай гаспадаркі».

«Нашы моцныя бакі — вытворчасць сельскагаспадарчых машын і агрэгатаў, зернесушыльных комплексаў, абсталявання для камбікормавых заводаў, выпуску харчовай прадукцыі, насенняводства і многае іншае. Я ўжо не кажу пра жывёлагадоўлю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі бок актыўна дзеліцца з аграрыямі Ленінградскай вобласці сваімі напрацоўкамі. Сярод іх, напрыклад, ветэрынарыя, дзе зроблены першыя крокі па развіцці супрацоўніцтва.

У тэму

У размове з журналістамі галоўным вынікам сустрэчы з Аляксандрам Лукашэнкам губернатар Ленінградскай вобласці назваў тое, што выканана пастаўленая задача — выйсці на аб'ём тавараабароту больш за мільярд долараў. «Мільярд у гэтым годзе будзе, і гэта галоўнае», — сказаў ён.

Па словах Аляксандр Драздзенкі, раней намянклатура грузаў складалася з прадукцыі сельскай гаспадаркі, нафтаперапрацоўкі, мінеральных угнаенняў, сёння гэта і тэхналогіі, і тэхніка, жыллёва-камунальная гаспадарка, энергетыка, навука, селекцыя, насенняводства і многае іншае. «Толькі ў гэту паездку мы хочам падпісаць некалькі новых кантрактаў на пастаўку больш чым 100 сучасных газавых кацельных. Актыўна ідзе газіфікацыя Ленінградскай вобласці, асабліва невялікіх пасёлкаў і вёсак, нам патрэбны сучасныя кампактныя кацельныя. Сёння іх у Беларусі вырабляюць. Навошта выдумляць веласіпед? Мы будзем купляць тое, што ёсць, тым больш вельмі добрыя суадносіны цаны і якасці», — сказаў губернатар. Па яго словах, у Ленінградскай вобласці субсідзіруюць пакупку беларускай тэхнікі, таксама як і расійскую тэхніку. І сёння аграрыі, леснікі, дарожнікі Ленінградскай вобласці выбіраюць беларускую тэхніку, бо вельмі добрыя адносіны цаны і якасці.

«І, што вельмі важна, мы шмат гаварылі аб гуманітарных сувязях і моладзі. Прэзідэнт сказаў, што за моладдзю — будучыня. І ад таго, якой будзе моладзь у Беларусі, у Расіі, залежаць і будучыня адносіны нашых краін. Мы павінны сёння быць як ніколі разам як брацкія народы», — сказаў Аляксандр Драздзенка.

Прэзідэнт Беларусі і губернатар Ленінградскай вобласці Аляксандр Драздзенка ў ходзе сустрэчы

Грыбны «квэст»

БЯРЫЦЕ З САБОЙ ТЭЛЕФОН!

Практычна кожны дзень, а то і па некалькі разоў за суткі ратавальнікі выязджаюць грыбнікам на дапамогу. У нядзелю супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях дапамаглі выйсці з лясного масіву траім жынчынам і пажылому мужчыну, якія заблукалі на Віцебшчыне.

Пасля абеду ў МНС патэлефанавала жанчына і паведаміла, што яна разам са сваёй дачкой і знаёмай заблудзіліся ў лясным масіве паблізу вёскі Саўчонкі Віцебскага раёна. Як высветлілася, раніцай жанчыны накіраваліся ў лес па грыбы. Калі яны зразумелі, што заблудзіліся, патэлефанавалі ратавальнікам. Сувязь са згубленымі супрацоўнікі МНС падтрымлівалі па мабільным тэлефоне: пацярпелыя тлумачылі, дзе яны прыкладна знаходзяцца. Ратавальнікі падзяліліся на групы і пачалі прачэсваць лес, перыядычна ўключаючы гучнагаварыцелі. Першым жанчын знайшоў ратавальнік Мікалай Мяшчанаў, крыху пазней да іх падышлі астатнія работнікі МНС, якія дапамаглі жанчынам выйсці з лесу і паднеслі сабраны ўраджай. Усе трое былі ў нармальным стане, дапамога медыкаў ім не спатрэбілася.

А ўжо бліжэй да вечара ратавальнікам Віцебшчыны патэлефанаваў мужчына. Пенсіянер паведаміў, што згубіўся ў лясным масіве паблізу вёскі Гародна Бешанковіцкага раёна. У пошуках удзельнічалі падраздзяленні МНС і супрацоўнікі органаў унутраных спраў — усяго восем чалавек на чатырох адзінках тэхнікі. Высветлілася, што ў гэты дзень бліжэй да абеду віцяблянін адправіўся ў лес па грыбы. Час праляцеў незаўважна, пачало цямнець — мужчына зразумеў, што не можа знайсці выхаду з лесу. На шчасце, мабільны тэлефон быў зараджаны: ён патэлефанаваў у службу ратавання.

Як распавёў **ратавальнік пажарнага аварыйна-ратавальнага атрада «Віцязь» Мікалай КАНСТАНЦІНАЎ,** першая спроба знайсці пацярпелага аказалася няўдалай. «Была ноч, моцны туман,

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

да таго ж сувязь са згубленым спынілася, бо тэлефон разрадзіўся, — расказаў ён. — Тады мы патэлефанавалі ў міліцыю з просьбай знайсці прыблізнае месца знаходжання мужчыны па тэлефоне, калі ён яшчэ быў у сецыве. Затым ратавальнікі яшчэ раз адправіліся ў глыбіню лесу, і праз некаторы час на гук сігнальна-размаўляльнай прылады мужчына выйшаў. Медыцынская дапамога выратаванаму не спатрэбілася».

Як звяртаюць увагу ратавальнікі, першае, што чалавек павінен узяць з сабой, збіраючыся ў лес, — тэлефон. Абавязкова зараджаны! У выпадку пазаштатнай сітуацыі той, хто згубіўся, можа паведаміць аб гэтым кампетэнтным органам. Акрамя таго, наяўнасць пры пацярпелым мабільнага тэлефона значна аблягчае яго пошукі.

АПРАНАЦЦА ЯРКА І ПАПЯРЭДЗІЦЬ БЛІЗКІХ

Увогуле, да паходу ў лес варта рыхтавацца. Збіраючыся па ягады або на ціхае паляванне нават на непрацяглы час, варта ўзяць з сабой невялікі запас ежы, ваду, нож і запалкі. Добра, калі вы паспяхова вернецеся дамоў. Калі ж заблукаеце, то гэты просты набор дазволіць пратрымацца некаторы час.

Вядома, у выпадку надзвычайнай сітуацыі ратавальнікі вас знойдуць, але ніхто ніколі не ведае, колькі гэта зойме часу. Некаторых згубленых адшукваюць за некалькі гадзін, на пошукі іншых нярэдка патрабуюцца суткі і больш. Так, на мінулых выхадных у Глыбоцкім раёне мужчыну, які заблукаў у лесе, ратавальнікі шукалі ўсю ноч. Вечарам 22 верасня ў МНС патэлефанаваў мужчына і паведаміў, што ён згубіўся ў лясным масіве паміж дзвюма вёскамі ў Глыбоцкім раёне. Сувязь з грамадзянінам падтрымлівалася па тэлефоне. У пачатку пошукаў ратавальнікі ўдакладнялі ў яго прыблізныя арыенціры. Гукі сірэны, якія падаваліся з пажарнай машыны, мужчына не чуў. Пошукі працягваліся ўсю ноч. Да ратавальнікаў далучыліся работнікі міліцыі і лясной гаспадаркі — усяго 15 чалавек. Толькі раніцай мужчына выйшаў на сувязь з ратавальнікамі і паведаміў, што ён выйшаў на нейкую прасеку. Пацярпелы ўдакладніў, што ў яго разраджаецца мабільны тэлефон. Супрацоўнікі МНС папрасілі, каб мужчына больш нікуды не ішоў і заставаўся на месцы.

— Мы разбіліся на групы і пачалі прачэсваць усе прасекі, — распавёў **ратавальнік Вячаслаў ЛУБЧОНАК.** — Я, ратавальнік Арцём Касцевіч і работнік лясгаса паглыбіліся па прасецы кіламетры на тры. У гукаўзмацняльную прыладу перыядычна клікалі мужчыну, праз некаторы час ён адгукнуўся. Мы ішлі наперад і ў хуткім часе ўбачылі таго, каго шукалі. Візуальна ён быў у нармальным стане, дапамога медыкаў не патрабавалася.

Калі чалавек рэгулярна прымае лекі, ратавальнікі рэкамендуюць узяць з сабой іх і падчас наведвання лесу. Як паказвае практыка, невядома, калі пасля збору грыбоў ці ягад чалавек вернецца дахаты, таму тое, што яму жыццёва неабходна, заўсёды павінна быць пры сабе. Акрамя таго спецыялісты раяць паклапаціцца і аб тым, у чым вы пойдзеце ў лес. Апранацца трэба так, каб у адзенні быў хаця б адзін яркі элемент — у надзвычайнай сітуацыі чырвоная куртка або аранжавая камізэлька дапамогуць быць заўважаным. Важна, каб адзенне і абутак не прамакалі.

Калі б мужчына, які днямі згубіўся падчас збору ягад у Ганцавіцкім раёне, не паведаміў аб сваім паходзе ў лес сястры, невядома яшчэ, як бы ўсё скончылася. Калі брат своечасова не вярнуўся дадому, жанчына забіла трывогу: суткі сваяк не выходзіў на сувязь, дома не начаваў. У пошуках мужчыны было задзейнічана шэсць адзінак тэхнікі і 17 чалавек. На ўключаную сігнальную гучнагаварыльную прыладу ніхто не адгукаўся, датэлефанавацца да мужчыны таксама не атрымалася: яго мабільны быў недаступны. Знайшлі пацярпелага пры аб'ездзе лясного масіву. Пасля агляду брыгадай хуткай медыцынскай дапамогі яго шпіталізавалі.

Вельмі стомленага і абяссіленага пенсіянера ратавальнікі знайшлі і ў лясным масіве Віцебскага раёна. Аб тым, што муж своечасова не вярнуўся дахаты, супрацоўнікам МНС паведаміла яго жонка. Мабільнага тэлефона з сабой у пенсіянера не было, таму жанчына ўказала ратавальнікам на месцы, куды звычайна муж ходзіць збіраць грыбы.

— На месцы мы пачалі прачэсваць лес і клікаць мужчыну, але ніхто не адгукаўся, — распавёў **ратавальнік Андрэй САМАТЫЯ.** — Абыходзячы лес, мы звярталі ўвагу на яры і канавы, каб не прапусціць мужчыну, калі раптам яму стала дрэнна і ён упаў. Праз некаторы час пошукаў я ўбачыў чалавека, які стаяў каля дрэва. Гэта быў той, каго мы шукалі. Мужчына быў вельмі стомлены і не мог самастойна перасоўвацца.

На насілках супрацоўнікі МНС вынеслі пенсіянера з лесу. Дапамога медыкаў яму не спатрэбілася.

Як адзначае **афіцыйны прадстаўнік Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Яўген БАРАНОЎСКІ,** перад паходам у лес аб сваіх намерах абавязкова варта папярэдзіць родных і блізкіх. «У выпадку, калі вы своечасова не вернецеся дахаты, будзе каму забіць трывогу, — тлумачыць ён. — Пажылым людзям, якія скардзяцца на дрэннае самаадчуванне або маюць хранічныя захворванні, увогуле варта ўстрымацца ад паходаў па грыбы або ягады. Таму, хто ў лесе бывае нячаста, аднаму хадзіць па лясныя дары ўвогуле не рэкамендуецца. Выбірайце сабе спадарожніка, які добра ведае мясцовасць».

Вераніка КАНЮТА.
Фота прэс-службы МНС.

ШТО РАБІЦЬ, КАЛІ ВЫ ЗАБЛУКАЛІ?

- Калі ж гэта ўсё-такі здарылася, у першую чаргу, не панікуйце!
- Прыслухайцеся! Гукі могуць дапамагчы вам высветліць, што знаходзіцца побач, ідзіце на іх. Шум трактара звычайна чуваць за 3-4 кіламетры, браханне сабакі — за 2-3 кіламетры, цягнік — за 10 кіламетраў.
- Шукайце лініі электраперадачы, прасекі і сцяжынкі — прытрымлівайцеся іх, і абавязкова выйдзеце да населеных пунктаў.
- Калі на шляху сустрэўся ручай ці рака, ідзіце ўніз па цячэнні — і заўсёды выйдзеце да людзей.
- Патэлефануйце ў МНС (па нумары 112) і паведаміце, з якога населенага пункта і якога раёна вы ўвайшлі ў лес, апішыце, што бачыце па баках. А калі вы апынуліся ў лесе без тэлефона, супакойцеся і настройцеся на добры выхад.
- Калі пачынае цямнець, сарыентуйцеся на мясцовасці і падумайце, дзе арганізаваць начлег. Для начлегу можна выкарыстаць яму ад вывернутага з коранем дрэва. Зрабіце з галін сховішча накшталт шалаша і посцілку з падручных матэрыялаў. Ліст газеты, засунуты пад адзенне, у два разы зменшыць цеплаадчуванне. Такі ж эфект дае і лістота, набітая пад адзенне. Паспрабуйце знайсці ваду. Арганізоўваючы начлег, паклапаціцеся аб тым, каб тыя, хто будзе вас шукаць, не прайшлі міма: дзеля прыцягнення ўвагі павесьце на кусты кепку, хустку або ліст паперы, абламайце галінкі.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Кітай выступіў супраць пашырэння ваенных блокаў у шкоду бяспецы іншых краін

КНР выступае супраць пашырэння ваенных блокаў, што негатыўна адбіваецца на бяспецы іншых дзяржаў. Пра гэта заявіў кіраўнік кітайскага знешнепалітычнага ведамства Ван І, паведаміла ТАСС. Кіраўнік МЗС КНР заклікаў стварыць спрыяльнае асяроддзе для ўсеагульнай бяспекі. «Надзвычай важна выступаць за агульную, комплексную, сумесную і ўстойлівую канцэпцыю бяспекі, настойваць на ўрэгуляванні рознагалоссяў і спрэчак паміж краінамі з дапамогай дыялогу і кансультацый», — падкрэсліў ён. Ван І адзначыў, што міжнародная супольнасць павінна ўмацоўваць супрацоўніцтва ў галіне біялагічнай бяспекі, бяспекі інтэрнэту, штучнага інтэлекту. Галоўнай тэмай міжнароднага парадку, паводле яго слоў, павінны стаць пытанні глабальнага эканамічнага развіцця. «Неабходна дазволіць краінам, якія развіваюцца, лепш інтэгравацца ў міжнародны падзел працы, зрабіць так, каб людзі ўсіх краін на больш справядлівай аснове карысталіся вынікамі развіцця», — адзначыў Ван І. Ён таксама выступіў супраць аднабаковых санкцый і раз'яднання эканамічных сувязяў. Паводле меркавання дыпламата, неабходна спрыяць пабудове справядлівай, разумнай і празрыстай гандлёва-эканамічнай сістэмы.

Шукальнікам прытулку ў Італіі прыйдзецца ўносіць заклад

Просьбіты прытулку ў Італіі павінны будуць уносіць заклад у памеры без малога пяці тысяч еўра, каб не трапіць у цэнтры прыёму бежанцаў на час разгляду іх заяўкі. Аб гэтым паведамляецца ў афіцыйным бюлетэні італьянскага Міністэрства ўнутраных спраў, перадае Euronews. Просьба аб выдзяленні фінансавай гарантыі датычыцца грамадзян са спіса «бяспечных» краін, адзначаецца ў пастанове. Раней шукальнікі прытулку маглі знаходзіцца на тэрыторыі Італіі без якіх-небудзь абмежаванняў і ўнясення закладу. Праваабаронцы ўжо раскрытыкавалі рашэнне ўлад, назваўшы такі крок «вымагальніцтвам у тых, хто ратуецца ад войнаў і голаду». Гэты год стаў рэкордным па колькасці мігрантаў, якія прыбылі ў Італію. Па некаторых ацэнках, у краіну дабраліся каля 133 тысяч просьбітаў прытулку, што амаль удвая больш, чым летась, і ўтрая больш, чым у 2021 годзе.

Узброеныя банды забілі 11 чалавек пры нападзе на камуну ў цэнтры Гаіці

Яшчэ 14 жыхароў населенага пункта атрымалі раненні. Пра гэта паведаміў мясцовы партал навін Haiti libre. Улады адзначаюць, што колькасць пацярпелых можа павялічыцца, паколькі грамадзяне асцерагаюцца выходзіць на вуліцу, каб дабрацца да бальніцы. Пры нападзе члены банды разрабавалі мясцовы паліцэйскі ўчастак і падпалілі некалькі аўтамабіляў. Аб затрыманнях або ліквідацыі тых, хто нападаў, не паведамляецца. Сітуацыя ў сферы бяспекі і гуманітарная абстаноўка пагоршыліся ў Гаіці пасля забойства ў ноч на 7 ліпеня 2021-га прэзідэнта краіны Жавенэля Маіза, а таксама землятрусу, што адбыўся ў жніўні таго ж года, у выніку якога загінулі больш за 2,2 тысячы чалавек. Раней тэлеканал Telesur паведамляў, што ўзброеныя банды кантралююць больш за 80 працэнтаў тэрыторыі гаіцянскай сталіцы і ўмацоўваюць свае пазіцыі ў іншых рэгіёнах краіны.

Сацыяльны аспект

На новы ўзровень

Работа па абнаўленні ФАПаў актыўна вядзецца на Піншчыне

Пасля майскай нарады па актуальных пытаннях аховы здароўя работа па навядзенні парадку, рамонту і абнаўленні сельскіх установ аховы здароўя прыкметна актывізавалася. Напрыклад, у Пінскім раёне з 39 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, якія функцыянуюць на тэрыторыі, цалкам прыведзена ў парадак 28. Некаторыя з установ пражылі вялікі рамонт і рэканструкцыю, асобныя наогул справілі навасёлле.

Тры з іх былі ўрачыста адкрыты ў гэтым месяцы. Не проста камфортныя ўмовы, але і новы ўзровень як аказання, так і атрымання медыцынскіх паслуг цяпер у медработнікаў і пацыентаў ФАПаў у аграгарадку Новы Двор, вёсках Чухава і Кашэвічы. Як адзначыў намеснік старшыні Пінскага райвыканкама Дзмітрый ПАЛХОЎСКІ, упор зроблены на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы, рамонт будынкаў, замену інжынерных камунікацый, даху.

— Работы вяліся ўнутры памяшканняў і звонку. Дзе патрабавалася, абнавілі мэблю і абсталяванне. Асвоена ўжо больш за 700 тысяч рублёў бюджэтных сродкаў. Робіцца ўсё, каб жыхары вёскі не адчувалі сябе абдзеленымі ў плане медыцынскай дапамогі ў параўнанні з гараджанамі, — гаворыць Дзмітрый Георгіевіч.

Тут размясцілі ФАП у Чухаве.

Падчас адкрыцця ФАПа ў Новым Двары.

У Новым Двары на адкрыццё ФАПа сабралася шмат людзей. Фельчарска-акушэрскі пункт памяняў дыслакацыю, са старога будынка ён пераехаў у новы. Для гэтага бібліятэку перанеслі ў іншае крыло Цэнтра культуры і адпачынку, а на яе месцы ўладкавалі медустанову. Калі ў ранейшым ФАПе не было ні вады, ні каналізацыі, то тут усе зручнасці ёсць. І цяпер можна гаварыць пра сучасную ўстанову аховы здароўя.

Работу паспяхова правялі спецыялісты філіяла СУ-138 ААТ «Будтрэст № 2». Як і належыць медыцынскай установе, перад уваходам устаноўлены пандус, для чаго спатрэбілася зрабіць цалкам новы ганак. Унутры была праведзена перапланіроўка, абноўлены столь, падлога, сцены, зроблена добраўпарадкаванне. Будаўнікі на гэтым аб'екце выступілі не толькі ў якасці падрадчыкаў, але і спонсарамі, на абсталяванне выдаткавалі 60 тысяч рублёў.

Як паведаміла загадчыца ФАПа Ала ГУЗАРЭВІЧ, цяпер іх установа мае ўсе выгоды, не трэба паліць печ, як было раней. Яшчэ з'явілася новае абсталяванне: партатыўны кардыёграф, апарат для вымярэння ўнутрывочнага ціску, іншыя патрэбныя прылады, у ліку якіх, напрыклад, электронныя вагі, асобна для дзяцей і дарослых. Цяпер маецца ўсё для таго, каб прымаць пацыентаў на адпаведным узроўні і праводзіць якасную дыспансерызацыю.

Паводле слоў кіраўніка справамі Навадворскага сельскага Савета Людмілы МАРЧУК, падчас адкрыцця людзі выказвалі падзяку за тое, што медыцынскую ўстанову размясцілі ў самым цэнтры. Раней яна была ўсё-такі наводдаль, а цяпер усё ў адным месцы: ФАП, крамы, пошта, іншыя сацыяльныя аб'екты, а гэта зручна.

У Навадворскім сельсавеце, дарэчы, у адзін дзень адзначылі навасёлле адразу два ФАПы, другі — у вёсцы Чухава. Тамтэйшая ўстанова таксама набыла новы выгляд пасля рамонту. Абслугоўвае фельчарска-акушэрскі пункт 786 чалавек, што на сотню болей, чым нават у Новым Двары. І там медустанова размясцілася ў вялікім будынку Дома культуры ў цэнтры вёскі.

Як падкрэсліў начальнік аддзела ідэалагічнай работы і па справах моладзі Пінскага райвыканкама Юрый БУШЫК, урачыстае адкрыццё медыцынскіх устаноў прымеркавалі да Дня народнага адзінства найперш для таго, каб правесці гістарычную паралель. Згодна з архіўнымі дакументамі, фельчарска-акушэрскія пункты ў Пінскім раёне адкрывалі ў 1939—1941 гадах і пасля вайны. Такім чынам, пасля ўз'яднання Беларусі медыцына па-сапраўднаму зрабіла крок у бок вёскі.

Старшыня Пінскага раённага Савета дэпутатаў Вячаслаў ЛАЗЮК сказаў, што гэтую патрэбную справу адолелі ўсёй грамадой:

Будынак ФАПа ў Новым Двары.

Фота Навадворскага сельвыканама.

— Падключылася мясцовая ўлада. Не засталіся ўбаку ад важнай дзяржаўнай справы сельгаспрадпрыемствы, будаўнічыя арганізацыі горада і раёна. І на ўрачыстым адкрыцці горача падзякавалі іх калектывам, многіх людзей адзначылі граматамі, падзячнымі пісьмамі райвыканкама і раённага Савета.

Большасць фельчарска-акушэрскіх пунктаў паспяхова працуе пасля рамонту. Як, напрыклад, ФАП у Беразцах, адзін з самых аддаленых у раёне. Раней медустанова тулілася ў старым будынку без вады, іншых камунальных зручнасцяў. Цяпер там ёсць усё, у памяшканні светла і ўтульна. Работа працягваецца на астатніх ФАПах, якія ўжо гатовы амаль на 90 працэнтаў. Напарадзе — клопат пра абнаўленне амбулаторый урача агульнай практыкі, участковай бальніцы сястрынскага догляду.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Спажывец

Сельгаскірмашы чакаюць мінчан

Даведаліся, як і дзе яны працуюць

У сталіцы стартаваў сезон сельскагаспадарчых кірмашоў. Яны пачалі працаваць на мінулым тыдні ў кожным раёне горада. Самы буйны разгарнуўся на пляцоўцы каля «Чыжоўка-Арэны». Аб гэтым распавяла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг Мінгарвыканкама Алена НАГОРНАЯ.

«Тут гандлююць найбольшая колькасць фізічных асоб і сялянскіх фермерскіх гаспадарак. Таксама там прымаюць актыўны ўдзел вытворцы мясной прадукцыі і іншыя прадпрыемствы перапрацоўчага комплексу нашай краіны», — адзначыла Алена Нагорная.

У кожным раёне сталіцы па выхадных днях арганізоўваюцца кірмашы. Вылучаецца Кастрычніцкі раён, у якім задзейнічаны дзве пляцоўкі. Партызанскі раён таксама абраў сваю спецыфіку: ужо трэці год запар лакацыі кожныя выхадныя змяняюцца. Гэта зроблена для зручнасці жыхароў, для таго, каб абсалютна кожны меў магчымасць бліжэй да дома набыць усё неабходнае.

На кірмашах працуюць валанцёры. Студэнты арганізоўваюць бясплатную дастаўку асобам сталага ўзросту і інвалідам тых рэчаў, якія яны набываюць. «Мы за гэтым старанна сочым, каб нікога не пакрыўдзіць і аказаць якасную паслугу, — падкрэсліла начальнік галоўнага ўпраўлення гандлю і паслуг. — Хачу звярнуць увагу жыхароў Мінска: акрамя кірмашоў, якія працуюць па выхадных, арганізавана работа 105 пляцовак, якія з 18 верасня працуюць штодня. Плануецца, што пры спрыяльных умовах надвор'я яны будуць функцыянаваць да 15 лістапада. Гандлёвыя пункты размешчаны такім чынам, каб мінчане мелі магчымасць увечары пасля работы набыць плодаагароднінную прадукцыю. У асноўным на іх працуюць тыя ж гандляры, якія ўдзельнічаюць і на кірмашах у выхадныя дні».

Фота БелТА

Алена Нагорная нагадала пра новаўвядзенне ў падатковым заканадаўстве, якое тычыцца юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ажыццяўляюць рознічны гандаль на кірмашах і на гандлёвых месцах: «Сялянскія фермерскія гаспадаркі і індывідуальныя прадпрымальнікі абавязаны мець пры ажыццяўленні гандлю на кірмашах касавае абсталяванне. На фізічных асоб, не зарэгістраваных у якасці індывідуальных прадпрымальнікаў, якія ўдзельнічаюць у кірмашах і маюць даведку аб тым, што ў іх ёсць прысядзібны ўчастак і там яны вырошчваюць пэўную прадукцыю, гэта не распаўсюджваецца».

Па словах Алены Нагорнай, за двое адпрацаваных выхадных па сельгаскірмашах тавараабарот склаў больш за 730 тысяч беларускіх рублёў. «Мы абавязаны забяспечыць жыхароў

сталіцы якаснай беларускай плодаагароднінай прадукцыяй. Таму тавараабарот, лічу, дастаткова нядрэнны. Але разам з тым хачу адзначыць, што на кірмашах рэалізоўваецца не толькі плодаагароднінная, але і мясная, і прадукцыя прадпрыемстваў Белкаапсаюза, мёд, саджанцы. Жывая рыба прапануецца ў абавязковым парадку. Дзяржаўнае аб'яднанне «Белводгас» прымае актыўны ўдзел не толькі на асноўнай пляцоўцы, але і ў раённых кірмашах».

Калі казаць пра склад удзельнікаў, то, вядома, пераважная большасць — фізічныя асобы. Людзі з нецярпеннем чакаюць час кірмашоў, каб рэалізаваць лішкі прадукцыі, і адказна ставяцца да спажыўцоў. Многія гандляры забяспечваюць дастаўку набытых прадуктаў да пад'езда.

«Па рашэнні Мінгарвыканкама мы плануем праводзіць кірмашы выхаднога дня да 26 лістапада, але гэта з улікам спрыяльных умоў надвор'я. У адпаведнасці з дзеючымі санітарнымі нормамі і правіламі, калі тэмпература паветра будзе складаць ніжэй за тры градусы са знакам плюс, на адкрытым паветры гародніну прадаваць нельга. Таму будзем арыентавацца і своечасова інфармаваць нашых спажыўцоў. Спадзяёмся, што як і летась дапрацуем да канца лістапада і надвор'е будзе спрыяць», — падагульніла Алена Нагорная.

Даніл ХМЯЛЬНІЦКІ.

СТАЦЬ ФЕРЗЁМ У СВАЁЙ ПРАФЕСІІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Насамрэч, ці заўсёды школа гатова прыняць маладога педагога пакалення «next»? Для старэйшых калег па прафесіі і для адміністрацыі школы малады настаўнік — часта такі ж дзіўны і незразумелы чалавек, як, скажам, сучасны старшакласнік. Ды і па ўзросце ён ад адзінаццацікласніка не моцна адрозніваецца. Натуральна, малады спецыяліст здзяйсняе шмат прафесійных памылак, ён менш дасведчаны, чым яго калегі, якія працуюць у школе ўжо не першы год. Да таго ж яму не заўсёды хапае ведаў па прадмеце, методыцы выкладання, навыках узаемадзеяння з вучнямі. Аднак замест слоў падтрымкі часта ў яго адрас гучаць крыўдныя пытанні: «І чаму вас толькі ва ўніверсітэце вучылі?» ці «Вы нават ГЭТАГА не ведаеце?» і г. д. А маладому настаўніку — прадстаўніку новага пакалення — неабходны поспех, кар'ера, прызнанне. І як жа важна не расчаравацца ў сваёй прафесіі ўжо на першых кроках.

Што значыць быць маладым педагогам? Пра гэта шмат разважалі ўдзельнікі Рэспубліканскага фестывалю «Педагагічны дэбют», фінал якога праходзіць гэтым днямі ў беларускай сталіцы.

Ствараць, накіроўваць, натхняць...

— У нас у сістэме адукацыі шмат навацый. Адна з іх, якая выклікае ва ўсіх толькі станоўчыя эмоцыі, — Рэспубліканскі фестываль «Педагагічны дэбют». У цэнтры яго ўвагі — маладыя настаўнікі, маладыя выхавальнікі дашкольных устаноў, маладыя дырэктары школ і маладыя загадчыкі ўстаноў дашкольнай адукацыі. Мы цудоўна разумеем: штогадовае папаўненне сістэмы адукацыі маладымі спецыялістамі надае імпульс яе развіццю, — падкрэсліў падчас урачыстай цырымоніі адкрыцця фестывалю-конкурсу **намеснік міністра адукацыі Аляксандр КАДЛУБАЙ.** — Звяртаючыся да ўдзельнікаў, хачу сказаць, што маладосць — гэта адначасова і перавага, і недахоп, таму што яна хутка праходзіць. Дык цаніце яе, не бойцеся праяўляць наватарства, смеласць, таму што ў вас пакуль адсутнічае закасцянеласць педагагічнага мыслення, якое ўласцівае больш старэйшым вашым калегам.

Вы знаходзіцеся бліжэй да сваіх выхаванцаў і вучняў, ведаеце, што ім цікава і якія формы і метады ў рабоце з імі лепш прымяняць. І ў той жа час вы можаце «запаліць» і больш вопытных сваіх калег, надаць новы імпульс і сваёй установе, і педагагічнай супольнасці, у якой вы працуеце. Форма фестывалю ўнікальная тым, што нароўні з дэманстрацыяй вашага прафесійнага таленту яна мае на ўвазе і фармат сяброўскіх стасункаў. Таму я шчыра жадаю ўсім атрымаць прафесійны запал і рэалізаваць у сцэнах сваіх навучальных устаноў усе творчыя ідэі, якімі вы тут узбагаціцеся... А фестываль, які праходзіць упершыню, мае вельмі добрую перспектыву — стаць новай традыцыяй у айчыннай сістэме адукацыі і ўпісацца ў рэспубліканскі прафесійны конкурсны рух.

Трэба заўважыць, што «Педагагічны дэбют» стартаваў у мінулым навучальным годзе. Яго ўдзельнікамі маглі стаць маладыя педагогі і кіраўнікі ўстаноў адукацыі ва ўзросце да 31 года, якія маюць стаж работы на пасадзе не больш як пяць гадоў, незалежна ад кваліфікацыйнай катэгорыі. Спачатку праходзілі раённыя, абласныя і Мінскі гарадскі этапы. Затым завочны рэспубліканскі этап, падчас якога настаўнікі і выхавальнікі пісалі эсэ «Я педагог і гэта...» і план-канспект урока па абранай тэме, а дырэктары школ і ўстаноў дашкольнай адукацыі — эсэ «Я — сучасны кіраўнік» і метадычную распрацоўку пасяджэння педагагічнага савета. У вочны этап прайшлі 24 педагогі. Першым выпрабаваннем для іх стала візітная картка на тэму «Пачатак педагагічнага шляху, а для кіраўнікоў — «Я і мая каманда».

— Жыццё поўнае сюрпрызаў, — гаворыць **выхавальнік маладзечанскага дзіцячага садка № 27 Настасся ВАСІЛЕВІЧ.** — Прызнаюся, што педагагічная прафесія не была маёй дзіцячай марай. У тым узросце я бачыла сябе толькі ветэрынарам. Але лёс прывёў на факультэт дашкольнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. І прафесія педагога стала для мяне жыццёвым арыенцірам.

Цяпер кожны крок напоўнены імкненнем ствараць, накіроўваць, натхняць... Аб сваіх выхаванцах магу расказваць гадзінамі: і аб кожным паасобку, і пра ўсіх разам.

«Яна — класная», «прыгожая зайка», «прыгожая пірожанка», «любімая», «ласкавая», «цікавая», «таленавітая», «клёвая», «самая найлепшая», «яна проста супер» — так кажуць пра сваю выхавальніцу дзеці.

«Канешне, прафесія педагога дорыць нямала сюрпрызаў, але мы з маімі выхаванцамі, моцна ўзяўшыся за рукі, ідзём разам. Я разам з імі мару, шукаю сябе, імкнуся ахапіць неабдымнае, узлятаю, не баючыся ўпасці, спадзяюся, веру і люблю. Разам нам пад сілу будзе любы экзамен жыцця, я толькі пачынаю пісаць яго старонкі і веру, што найбольш важнай главой стане педагогіка. Аднак гэта не адзіная глава. Бо, як казаў Антон Паўлавіч Чэхаў, дрэнны той педагог, які не з'яўляецца мастаком і артыстам, горача ўлюблёным у сваю справу. **Прафесія выхавальніка мае на ўвазе наяўнасць фантазіі, эмацыянальнасці, харызмы, уменне імправізаваць і імпанаваць.** Развівацца ў гэтым кірунку мне дае мадэльнае мастацтва, рэклама дзіцячага адзення і візаж, аднак шчасце заляжыць не ад прыгожых сукенак, модных прычосак і прафесійнага макіяжу. Яно залежыць ад песні, якую пяе наша душа...»

Зрабіць складанае цікавым

— Я дакладна ведаю, калі распачаўся мой шлях у прафесію, — расказвае пра сябе **Дзмітрый РАГАЎЦОЎ.** — 7 сакавіка 2015 года ў школе быў дзень самакіравання. На мяне ўсклалі ролю настаўніка фізікі і біялогіі. Быць настаўнікам мне спадабалася літаральна з першай хвіліны, як толькі ўвайшоў у клас. Я зразумеў, што дзяліцца сваімі ведамі з дзецьмі — штосьці неверагоднае! Менавіта пасля гэтага я цалкам пераканаўся, што хачу быць педагогам. Ніякіх іншых варыянтаў! І вось я ўжо студэнт Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Аркадзя Куляшова. Апошнія паўтара года вучобы паралельна працаваў настаўнікам фізікі ў сельскай школе, і веды, атрыманыя ва ўніверсітэце, не адкладваліся на больш позні час, а прымяняліся тут і зараз.

Чэрвень 2019 года. Я — дыпламаваны спецыяліст. Жнівень — **настаўнік фізікі ў бабруйскай сярэдняй школе № 31.** Эмоцыі перапаўняюць. Ідзі змяняюць адна адну з хуткасцю гуку. Так хочацца ахапіць неабдымнае. У той час мне падавалася, што я напоўнены ўсімі неабходнымі ведамі, уменнямі і навыкамі, як вось гэты сасуд. Але надышло 1 верасня, і я ўжо літаральна на першых уроках сутыкнуўся з шэрагам праблем, якія дапамаглі мне зразумець, што напоўнены, на першы погляд, сасуд такім не з'яўляецца. Мне на дапамогу прыйшлі старэйшыя калегі, і я зразумеў, што трэба пастаянна самаўдасканальвацца, бо, як кажа народная мудрасць, **колькі жыве настаўнік, столькі вучыцца.**

Маё ўзаемадзеянне з навучэнцамі базіруецца на асноўных прынцыпах педагогікі супрацоўніцтва. Я вучу дзяцей таму, што ўсё цікавае — складанае, а ўсё складанае — цікавае. А наша жыццё — як паветраны шарык: калі яго не адпусціць, нельга зразумець, як высока можна ўзняцца. Я яшчэ ў самым пачатку свайго педагагічнага шляху, але разумею, што педагагічны сасуд ніколі не можа быць цалкам поўным. А яшчэ як фізік я дакладна ведаю, што пройдзе час, вада выпарыцца, і сасуд зноў прыйдзецца напаўняць, паколькі няма мяжы для ўдасканалення. Мне яшчэ вельмі далёка да дасканаласці, але я дакладна ведаю, што трэба займацца самымі важнымі рэчамі ў гэтым жыцці, неабходна правільна расстаўляць прыярытэты, каб выканаць місію, ускладзеную на настаўніка.

Даць магчымасць больш думаць

— Што наша жыццё? Гульня. А ў кожнай гульні ёсць выбар. Мой выбар — прафесія педагога, — кажа **Андрэй МАРОЗАЎ, настаўнік гісторыі з Лошніцкай гімназіі Барысаўскага раёна.** — Калі прадставіць мой шлях педагога-пачаткоўца ў выглядзе шахматнай партыі, то стане зразумелым, што кожны крок — гэта фігура, якая перасоўваецца па полі. Для мяне як для настаўніка гісторыі шэсць шахматных фігур асацыіруюцца з асноўнымі прынцыпамі ў маёй прафесіі. Кароль — самая галоўная фігура, без якой не будзе сыграна ніводная партыя, не пройдзе ніводнае дзеянне. **Для мяне кароль асацыіруецца з настаўнікам, місія якога заключаецца ў тым, каб весці дзяцей за сабой,** быць каралём не над імі, а разам з імі, радавацца кожнаму іх поспеху і сумаваць, калі штосьці пойдзе не так, сумесна шукаць шляхі выхаду з са складаных сітуацый. Ферзь — самая моцная фігура. Я хачу быць моцным у веданні свайго прадмета, а яшчэ ў алімпіядах, конкурсах ды паўсюдна. Быць ферзём у сваёй прафесіі, мяркую, хоча кожны. Для мяне важныя творчасць, мэтанакіраванасць, уменне працаваць над сабой...

Андрэй МАРОЗАЎ: «Шэсць шахматных фігур асацыіруюцца з асноўнымі прынцыпамі ў педагагічнай прафесіі...»

Дзмітрый РАГАЎЦОЎ: «Як фізік, я ведаю, што сасуд зноў прыйдзецца напаўняць...»

Слон — фігура дальнабойная. Відавочны яе недахоп заключаецца ў тым, што слон можа перасоўвацца толькі па клетках свайго колеру. Але на маім педагагічным полі гэта плюс: тайм-менеджмент, перавернуты ўрок, уменне размяркоўваць патэнцыял навучэнцаў з улікам іх матывацыі. Упэўнены, што пры ўзважаным размеркаванні вынік перавысіць усе чаканні...

Самая незвычайная фігура — конь. Яго ўменне пераскокваць праз перашкоды дазваляе яму здзяйсняць асаблівыя хітрасці, якія я называю тактычнымі прыёмамі. Галоўнае, чаго прытрымліваюся ў выкладанні гісторыі, — гэта даць навучэнцам магчымасць больш думаць. Любая сучаснасць — праз імгненне ўжо мінулае. І мы не пабудуем будучыню, не зрабіўшы ўрокаў з мінулага.

«Пешка — душа шахмат», — так паэтычна ахарактарызаваў яе французскі шахматыст XIX стагоддзя Андрэ Філідор. Яна абараняе і падтрымлівае асноўныя фігуры, а ў выпадку поспеху становіцца адной з наймацнейшых фігур. Тут на памяць прыходзяць словы Суворава, што дрэнны той салдат, які не марыць стаць генералам. Здаровыя амбіцыі — гэта заўсёды прарыў. Сучасны настаўнік — гэта настаўнік, які здольны ствараць камфортныя ўмовы, развіваць ініцыятыву. Ну вось і ўсё — шэсць шахматных фігур, але якія складаныя задачы яны могуць вырашаць.

Калі камунікатыўнасць суміраваць з фундаментальнасцю ведаў свайго прадмета і памнажыць на імкненне і пошук, то вынікам паспяховага праходжання педагагічнага шляху стане любоў да дзяцей і створаная каманда аднадумцаў, здольная пераадолець любыя перашкоды. Вось мая формула. Атрымаць прызнанне вучняў і рэалізаваць сябе з першых дзён работы ў школе, ці магчыма гэта? Упэўнены, што магчыма, галоўнае — верыць у заўтрашні дзень, не баяцца ўкараняць і апрабоўваць, вучыцца і вучыць. **У кожнага вучня трэба верыць — вось маё крэда.** Умець быць аб'ектыўным, забяспечыць даступнасць падачы матэрыялу, цікавую пабудову ўрока, бачыць на перспектыву, быць валанцёрам, лідарам, патрыётам, заўсёды верыць у сваю прафесію... Гэта толькі першыя крокі, і я ведаю дакладна, што мой шлях у педагогіцы працягваецца.

У фінале рэспубліканскага фестывалю «Педагагічны дэбют» педагогаў чакае яшчэ некалькі выпрабаванняў: адкрыты ўрок у незнаёмым класе, адкрыты занятак у незнаёмай групе па прапанаванай журы тэме і публічнае выступленне перад грамадскасцю на тэму «Я педагог! І гэта...» Кіраўнікоў чакаюць майстар-клас кіраўніцкай дзейнасці і публічнае выступленне на тэму «Мая формула поспеху». А 28 верасня ўдзельнікаў фестывалю ўзнагародзяць разам з удзельнікамі заключнага этапу конкурсу «Настаўнік года Рэспублікі Беларусь». Маладыя педагогі запрошаны на ўрачыстую імпрэзу да Дня настаўніка ў Палацы Рэспублікі.

Надзея НІКАЛАЕВА.
Фота Лізаветы ГОЛАД.

«...ЗНАЧЫЦЬ, ЛЮДЗІ НЕ ЗАБЫЛІ СВАЮ РОДНУЮ МОВУ,

чытаюць на ёй — і «Звязду» таксама»

Ад сумнага да смешнага — крок (і назад — вядома ж — не болей). У мінулым стагоддзі стараннай, паслухмянай дзяўчынцы, якая не паступіла ў інстытут, радня, па так званым блаце, знайшла неблагую работу — сакратаркай у прыёмнай дырэктара... На пытанне, чым жа ўнучка займаецца (а яна якраз асвойвала друкарку (пішучую машынку), бабуля з форсам адказвала: «Дуркуе...»

Акурат такое ж дзяўчо, у такой жа прыёмнай, але ў гэтым стагоддзі пасадзілі ўжо за камп'ютар і ў першы працоўны дзень папрасілі зайсці на пошту. Новая сакратарка (вось табе і паслухмяная?!) нават з месца не ўстала, заявіла: «Пісьмаў няма»...

Аб тым, што яны могуць быць не толькі ў камп'ютары на электроннай пошце, але і на звычайнай, размешчанай у суседнім будынку, яна проста не здагадалася, хоць (заўважце!) колькі там часу прайшло ад бабулінага «дуркуе»? Вобмаль, як кот наплакаў! Аднак за тыя «слёзы» да непазнавальнасці змяніўся не толькі спосаб напісання лістоў (ад шарыкавай асадкі да кам'ютара), не толькі хуткасць дастаўкі... У пісьмах, што прыносіць электронная пошта (тут і далей — пра пошту «Звязды»), ужо амаль не сустрэнеш сардэчнага: «Добрых дзён, дарагая рэдакцыя! Піша табе...» (і г. д.). У іх, электронных лістах, як правіла, «усё па сутнасці»: інфармацыя, пытанне, роздум, успамін, праўдзівая гісторыя, верш... Іншымі словамі, тое, што чытач знойдзе потым на старонках газеты пад рубрыкамі «Весткі з месцаў», «Была вайна», «Перажытае — незабытае», «Камандзіроўка па пісьму», «Чалавек — чалавеку», «...Народ на провадзе!», «Хто каго?»...

Але ж знойдзе — на жаль, не ўсё, па розных, уважлівых прычынах, а найперш — з-за недахопу месца на старонках «Звязды», бо мала хто (і не толькі з чытачоў) умее пісаць коратка. Тут і цяпер якраз пра вось гэту рэшту — у пераказе.

«...Да сёння ў памяці два імгненні. Першае — напрыканцы мінулага стагоддзя мы з калегам зайшлі ў цырульню на сталічнай вуліцы Маркса, — піша наш пастаянны чытач **Аляксандр Матошка з Расоншчыны:** — *А там — чарга. І не малая... «Глянь, гэта ж Ніл Гілевіч», — шапнуў мой спадарожнік. І сапраўды — ну ні з кім не зблытаеш: сур'ёзны, засяроджаны твар, удумлівы, мудры позірк.*

Другое — некалі ў газеце «Звязда» быў надрукаваны артыкул «Магутны Ніл», а на здымку ён у такім звычайным берэціку...

За гады, дзесяцігоддзі сталага жыцця я шмат каго перачытаў, у тым ліку з нашых айчынных класікаў — да «магутнага Ніла» «даплыў» толькі цяпер. «Паэзія — вечная мара аб Шчасці, вечная прага Гармоніі ў свеце, Згоды і Ладу паміж людзьмі.

А тым часам — жахлівы прывід хаосу стукаецца ў дзверы нашага дому...»

Такімі словамі пачынаецца першы том выбраных твораў паэта, выдадзены ў 1991 годзе. Ці не пра сёняшні дзень у свеце?

А далей — чытаць, чытаць і чытаць, захапляцца веліччу роднай мовы, якая — з-пад пяра Майстра — дыяментам асвятляе думкі: любавацца вянком санетаў «Нарач» і маленечкім вершам «Белыя сыплюцца долу крышталікі...», шчыра смяяцца з герояў камедыі «Формула іржавіны».

Словы паэта і на мемарыяльным вянцы ў Хатыні: «Людзі добрыя, помніце, мы любілі жыццё і радзіму нашу, і вас, дарагія! Мы згарэлі жывымі ў агні, наша просьба да ўсіх: хай жалоба і смутак абернуцца ў мужнасць і сілу, каб змаглі ўвекавечыць вы мір і спакой на зямлі. Каб нідзе і ніколі ў віхры пажараў жыццё не ўмірала!»

«Вобраз Ніла Сымонавіча, — згадваючы як бы «сустрэчу», піша наш чытач, — *і цяпер перад вачыма, — строгі і велічны, з радзімкай на правай шчацэ... Задуменны:*

«У гэты век, што адвучыў маўчаць, // У кожным абудзіўшы сверб размовы, // Я веру ў нясказаныя словы, // Якім, магчыма, і не прагучаць. // Дзівак, наіўны, смешны, як дзіця, // Я веру ў іх, як веруючы — ў догмы. // І гэтай веры хопіць мне надоўга. // Ва ўсякім разе — да канца жыцця».

***

Кажуць, у Празе над брамай, што вядзе на Вышаградскія могілкі, дзе знаходзіцца пантэон вялікіх чэхаў, напісана: «Хоць памерлі, але прамаўляюць»... Нашы вялікія таксама не маўчаць. «Вучыцеся і чытайце. Чытайце кнігі сур'ёзныя, — раіў не менш магутны Фёдар Дастаеўскі. — Жыццё зробіць астатняе». Калі будзе мір...

Гэта ўдакладненне — з ліста **спадарыні Таццяны Чэкед з Гомеля.** *«Мой тата Міхаіл Міхайлавіч Сіпакоў прайшоў вайну ад пачатку да канца... У адным з баёў быў цяжка паранены, аднак пасля шпіталя зноў пайшоў на фронт і на радзіму вярнуўся пераможцам. Я заўсёды ганарылася і ганаруся сваім татам,* — піша дачка. — *Дзякуючы яму і яго пакаленню мы жывём пад мірным небам і ніколі не падумалі б, што ўсё пачне вяртацца назад, што ў суседстве з намі будзе адбывацца тое, што адбываецца...*

Сёлетні, ужо сыходзячы, год аб'яўлены годам Міру і стваральнай працы. Як жа зрабіць, каб не толькі гэты, але і ўсе наступныя гады, дзесяцігоддзі былі якраз такімі, без кровапраліцця?»

Дзеля дасягнення гэтай мэты, на думку Таццяны Міхайлаўны, усе *«народы павінны аб'яднацца ў адно цэлае, як тыя ж пяць пальцаў, і зрабіць усё! Толькі яднанне і ўзаемаразуменне, толькі спагада і любоў уратуюць мір».*

І свет, як выглядае, таксама.

***

«На свята Перамогі мы заўсёды збіраемся разам, — піша **Наталля Сівак з Чэрвеньскага раёна.** — *Гэтая традыцыя — яшчэ з маленства, калі да таты прыходзілі яго сябры-франтавікі, сядзелі за сталом, успаміналі жывых і загінулых, спявалі ваенныя песні. Так было штогод, пакуль татулечка быў жывы. Я расказвала пра яго і гэтыя сустрэчы сваім дзецям, цяпер расказваю ўнучкам. Традыцыя, дзякуй богу, не абрываецца.*

Вось і сёлета надвячоркам прыехалі мае сын і дачка са сваімі сем'ямі. Абняліся, парадаваліся сустрэчы. Толькі ўнучка Ірынка была чамусьці надта сур'ёзная. «Я хачу табе нешта расказаць», — паабяцала мне, і мы з ёй прыселі на канапу. «Ведаеш, бабуля, аднойчы на нашу краіну напалі «фуршысты». Яны ўсіх забівалі. Нават маленькіх дзяцей, — голас у малечы дрыжаў, у вочках блішчэлі слёзы. «А хто ж такія фуршысты?» — спыталася я. «Гэта такія маленькія зялёныя жывёліны...» (Магчыма, выхавацелька ў садку нешта расказвала пра зялёную форму фашыстаў? Магчыма, ужывала слова «нелюдзі», якое дзіця зразумела па-свойму... І тым часам працягвала расповед). «Фуршысты прыехалі да нас на танках. А Сонін дзядуля быў танкістам. Ён давіў іх, давіў...»

— Я ўзяла ўнучку за руку, — працягвае Наталля Рыгораўна, — *і падвяла да партрэта майго таты. Сказала: «Гэта, Ірачка, твой прадзядуля Грыша. Ён лятаў на самалёце і з неба страляў па фашыстах, збіваў іхнія самалёты...»*

Простымі словамі я пастаралася расказаць дзіцяці пра тую вайну, пра Свята Перамогі. Паказала ўзнагароды прадзеда, які і сапраўды быў паветраным стралком-радыстам 207 Керчанскага гвардзейскага асобнага разведвальнага авіяцыйнага палка. Звалі яго Рыгор Паўлавіч Зольнікаў... Дадала яшчэ, што 9 Мая, у дзень Свята (ад слова «святое»!), людзі прыносяць кветкі салдатам-пераможцам.

Мы таксама нарэзалі прыгожы букет цюльпанаў і нарцысаў, паклалі каля помніка, што стаіць у нашай вёсцы. Але спачатку зрабілі некалькі фотаздымкаў дома. На іх Ірынка ў салдацкай форме і з партрэтам прадзеда».

Так з пакалення ў пакаленне перадаюцца традыцыі, памяць.

***

«Па вечарах (бо днём жа справы, няма калі...) мы часта гутарым з сяброўкай-зямлячкай пра свой Давыд-Гарадок, пра наша дзяцінства, школу, агульных знаёмых, — піша **спадарыня Валянціна Гудачкова.** — *Неяк раз сталі ўспамінаць тыя часы, калі толькі пераехалі ў Жыткавічы, калі пачулі мясцовую гамонку. Нам так смешна тады было: пра вельмі зручную рэч тут казалі «таке лоўке», пра нешта высокае — «нагле», падворак называўся (і называецца) селішчам, пайсці ў краму — значыць, пайсці «на горад», а хутка пайсці (альбо нешта зрабіць) — гэта ўжо «мітэлем» — не іначай.*

Адна маладзіца вось гэтак, мітэлем, збіралася — спяшалася на спатканне. На паўдарозе ўспомніла, што «свісток не намазала». Не ведаеце, што б гэта значыла? Тады скажу: вусны не падчырвоніла...

Вакол нас вельмі шмат прыгожага і цікавага. Не лянуйся толькі — глядзі ды слухай, шануй...

А яшчэ — дададзім — запамінай, успамінай і... пішы — для сябе, бо шмат што забудзешся, для дзяцей і ўнукаў, бо гэта мо цяпер, малым, ім не трэба, а потым — як знойдуць, для іншых людзей, бо многім сапраўды цікава. Старая показка: «Адзін з'еш хоць вала, — адна і хвала». Дзяліцца трэба і тады...

***

Дзень добры, мая любімая «Звязда»! Пяць разоў на тыдзень да нас прыходзяць твае свежыя нумары, і я тады адразу ж кідаю ўсе справы, — піша **спадарыня Бабко-Аляшкевіч з Салігоршчыны,** — *саджуся чытаць і заўсёды знаходжу нешта цікавае, аб чым нават не здагадалася б спытаць разумнага інтэрнэту! А тут — акуляры начапіў і нешта даведаўся, аб нечым задумаўся, успомніў, усміхнуўся, парадаваўся. Дзякуй вам... Яшчэ і за тое, што даяце слова сваім чытачам, знаходзіце месца для іх творчасці, для тых жа «праўдзівых гісторый». На мае, змешчаныя ў газеце, прыходзяць водгукі з многіх куткоў краіны. Значыць, людзі не забылі сваю родную мову, чытаюць на ёй — і «Звязду» таксама, а хто-ніхто з маіх знаёмых, можа, стаў і падпісчыкам?*

Хацелася б верыць! Яшчэ і спадару **Івану Янкову з Мінска,** які дзякуе газеце *«за яе*

нястомную і вельмі патрэбную працу, за тое, што «Звязда» не дае беларусам забыць, што яны беларусы, за тое, што ў «Неасабістым суб'ектыве», у «Нефармаце», у «Простай мове», «Ігуменскім тракце» аўтары пішуць як быццам пра сябе, пра свае ўражанні ды ўспаміны. І ў той жа час — гэта як бы пра мяне, а можа, і пра ўсіх беларусаў, бо ў нас агульная доля і агульная зямля са шчодрымі лясамі і палямі, з прыгожымі кветкамі...

Але ж на ёй яшчэ — безліч напамінаў пра мінулыя войны, на ёй — вёскі і вёсачкі, у якіх ледзьве ліпіць жыццё, пітушчыя бацькі, дзіцячыя дамы і дамы састарэлых... «Звязда» працуе каб зберагчы нашы душы, а ў іх — родную мову і культуру, каб не дазволіць забыць перажытае, каб усё засведчыць і нашчадкам расказаць, як мы жылі.

У гэтым ды многіх іншых, скажам так, неэлектронных лістах, дзе пакуль яшчэ застаецца месца для нечага «неістотнага», у канцы — прыпіска: *«Па-ранейшаму застаюся з вамі».*

А ў **спадарыні Ніны Суран з вёскі Горная Рута, што ў Карэліцкім раёне,** — нават верш «у тэму»:

Гэта пэўна ўжо любоў:
Я, «Звязда», з табою зноў!
Ты, хоць зорка, —
ды не з неба,
Ты — была і ёсць, што трэба!

Якой — і «была, і ёсць» — Ніна Іванаўна ведае як, магчыма, ніхто ці нямногія з нашых чытачоў, бо пастаянна выпісвае і чытае «Звязду»... 48 гадоў (!).

Здымаем капялюш, як той казаў, дзякуем за вернасць — ёй і, карыстаючыся выпадкам, усім, хто ў першы ці чарговы раз аформіў падпіску, хто чытаў і будзе чытаць па-беларуску (магутнага Ніла, Купалу і Коласа, Барадуліна і Бураўкіна, Караткевіча... Найстарэйшую беларускую «Звязду»), хто пісаў і, магчыма, будзе пісаць нам.

А ўжо якой пошце даверыць дастаўку, не так і важна: мы рады кожнаму лісту — у канверце і без. Толькі б з адрасам ды нумарам тэлефона — для аператыўнай зваротнай сувязі.

Аддзел пісьмаў.

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА
27 верасня 2023 г. № 35 (721)
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

На знешнім і ўнутраным контурах

Падрабязнасці працоўнага тыдня сенатараў

● Намеснік Старшыні Савета Рэспублікі, Нацыянальны каардынатар па дасягненні Мэт устойлівага развіцця Валерый Бельскі і старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рачкоў прынялі ўдзел у Саміце па Мэтах устойлівага развіцця, які адбыўся ў Нью-Ёрку. На палях Саміта беларускія парламентарыі правялі шэраг сустрэч. У прыватнасці, падчас сустрэчы з памочнікам Генеральнага сакратара ААН па каардынацыі развіцця Оскарам Фернандэсам-Таранко былі абмеркаваны пытанні эскалацыі напружанасці ў рэгіёне Усходняй Еўропы і пагрозы Рэспубліцы Беларусь у сувязі з падтрымкай Польшчай і Літвой тэрарыстычных арганізацый. Сенатары прадставілі факты незаконнай дзейнасці, якая падтрымліваецца дзяржаўнымі структурамі недружалюбных краін. Была засяроджана ўвага на неабходнасці міжнароднай ацэнкі і супрацьдзеяння такім тэндэнцыям. Беларуская парламенцкая дэлегацыя праінфармавала аб разбуральным характары палітычных і эканамічных санкцый у дачыненні да нашай краіны. Па словах Валерыя Бельскага, спыненне дзеяння дагавораў аб прававой дапамозе негатыўна адбіваецца не толькі на забеспячэнні бяспекі, але і на пытаннях супрацьстаяння адмыванню сродкаў, атрыманых незаконнымі спосабамі, у тым ліку шляхам махлярства з выкарыстаннем камп'ютарных тэхналогій, а таксама дзейнасці трансгранічных наркатычных карцеляў.

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па эканоміцы, бюджэце і фінансах Таццяна Рунец правяла асабісты прыём грамадзян. Парламентарый разгледзела звароты па пытаннях дзеючай сістэмы рэгулявання цэн, паляпшэння жыллёвых умоў для шматдзетных сямей, сацыяльнай падтрымкі маці, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, і шэраг іншых.

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргей Сівец у рамках адзінага дня інфармавання сустрэўся са студэнтамі і выкладчыкамі Баранавіцкага дзяржаўнага ўніверсітэта. Асноўная тэма сустрэчы — «Адзінства беларускага народа — асноўны фактар захавання і ўмацавання суверэнітэту і незалежнасці краіны». Парламентарый падрабязна расказаў пра гісторыю дзяржаўнага свята 17 верасня — Дня народнага адзінства. Сенатар падкрэсліў важнасць адзінства нацыі ў сучасных умовах, асабліва ў кантэксце выклікаў і пагроз, якія стаяць перад краінай, і выказаў упэўненасць у тым, што дзякуючы сумесным намаганням усіх слаёў насельніцтва Беларусь зможа паспяхова супрацьстаяць знешнім і ўнутраным выклікам, захоўваючы сваю незалежнасць і суверэнітэт. «Мінулае дало беларусам нямала суровых урокаў, — заўважыў Сяргей Сівец. — Галоўны вынік пражытага і перажытага намі ў тым, што незалежную Рэспубліку Беларусь мы будуем разам, у народным адзінстве».

● Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці Ірына Старавойтава прыняла ўдзел у сустрэчы з удзельнікамі Форуму беларускіх і кубінскіх рэктараў — дэпутатамі Нацыянальнай асамблеі народнай улады Рэспублікі Куба. На форуме, які адбыўся ў рамках візіту ў Беларусь дэлегацыі Міністэрства вышэйшай адукацыі Рэспублікі Куба на чале з намеснікам міністра вышэйшай адукацыі Кубы Рэйнальда Веласкесам Зальдзіварам, выступілі рэктары вядучых універсітэтаў Беларусі і Кубы. Яны расказалі аб магчымых напрамках двухбаковага супрацоўніцтва ў навуцы, адукацыі і маладзёжнай палітыцы. Па выніках мерапрыемства было падпісана больш чым дзясятак дагавораў двухбаковага супрацоўніцтва паміж універсітэтамі. У ходзе сустрэчы беларускіх парламентарыяў з кубінскімі дэпутатамі абмеркаваны пытанні пашырэння беларуска-кубінскага міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і развіцця двухбаковага супрацоўніцтва ў сферы адукацыі. Ірына Старавойтава выказала ўпэўненасць у тым, што праведзеныя ў ходзе візіту сустрэчы, І Форум беларускіх і кубінскіх рэктараў і важкі пакет падпісаных пагадненняў унясуць істотны ўклад у развіццё сумесных форм супрацоўніцтва, абмен перадавым вопытам у сферы адукацыі.

Вераніка КАНЮТА.

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

РЭАБІЛІТАЦЫЯ, МАЁМАСЦЬ, ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС

З якімі пытаннямі прыходзілі людзі на прыём да Наталлі КАЧАНАВАЙ

Чарговы прыём грамадзян Старшынёй Савета Рэспублікі Наталлі Качанавай быў, як заўжды, насычаны рознымі пытаннямі: медыцына, жыллё і нават камерцыя. Слухаючы заяўнікаў, спікер адзначыла, што пры дапамозе такіх мерапрыемстваў можна вызначыць пытанні, якія патрабуюць карэкціроўкі заканадаўства. Многія праблемы яна бярэ пад асабісты кантроль, таму што складанасцяў у іх вырашэнні хапае.

Фота Віктара ВАЎЧЫКАВА.

Страта здароўя і намаганні яго аднавіць

Рыгор з Салігорска амаль 30 гадоў адпрацаваў шахцёрам на прадпрыемстве «Беларуськалій». У 2011-м ён атрымаў датэрміновую пенсію за выслугу гадоў. У гэты ж час у яго пачаў пагаршацца слых, і ён штогод праходзіў медкамісію. У 2019-м выйшла пастанова Міністэрства аховы здароўя № 74 «Аб правядзенні абавязковых і пазачарговых медыцынскіх аглядаў працоўных», якой узмацніліся падыходы да стану здароўя. І ў студзені 2020 года яго па стане здароўя вывелі з шахты. Шахцёр даказваў, што гэта прафесійнае захворванне, і мясцовыя ўрачы накіравалі яго ў 10-ю бальніцу ў Мінску, дзе ў яго выявілі нейрасенсорную тугавухасць, хранічны бранхіт і бранхіяльную астму. Ён вярнуўся да сябе ў паліклініку, дзе сталі правяраць, у тым ліку на рабочым месцы, ці прафесійныя гэта захворванні. На МРЭК у студзені 2021-га года яму прызначылі III групу інваліднасці і 15 % страты працаздольнасці. Рыгор у 55 гадоў выйшаў на пенсію. Год атрымліваў пенсію і дадаткова 15 % за страчанае на працы здароўе, а пасля выплаты зменшылі і групу памянялі. Такую гісторыю расказала на прыёме яго жонка Святлана:

— Праз год мужу знялі прафесійнае захворванне, прызначылі II групу і ліквідавалі працэнт страты працаздольнасці, таму што летам 2021-га выйшла пастанова Саўміна № 304 «Аб медыка-рэабілітацыйных экспертных камісіях і медыцынскіх экспертызах», дзе сказана, што «ступень страты прафесійнай працаздольнасці не вызначаецца, калі наступствы няшчаснага выпадку на вытворчасці ці прафесійнае захворванне ў перыяд працоўнай дзейнасці не пацягнулі страты пацярпелым прафесійнай працаздольнасці да прызначэння яму пенсіі па ўзросце ці пенсіі за выслугу гадоў». І цяпер МРЭК кажа, што трэба было вырашаць гэтыя пытанні, калі пагоршыўся слых. Чаму гэтую пастанову (2021-га) прымянілі да майго мужа, калі ён ужо прайшоў усе камісіі (у 2020-м) і год даказваў сваё прафзахворванне?

1 лютага 2022-га на МРЭК працэнты выплат па страце здароўя сапраўды абнулілі, аднак праз чатыры месяцы цэнтральная РМЭК аднавіла 5 % выплат з 15 %, патлумачыў **Юрый ГОРБІЧ, намеснік міністра аховы здароўя:**

— У 2019-м шахцёру была вызначана інваліднасць па асноўным захворванні, якое не з'яўляецца прафесійным, і гэта была памылка МРЭК, якая прызначыла яму 15 %. На той момант страта працаздольнасці была па асноўным захворванні. А вось у пастанове № 304 яшчэ сказана, што калі пацярпелы выконваў працу ў тых жа ўмовах без зніжэння кваліфікацыі... а прафесійнае захворванне ўзнікла пасля таго, як ён выйшаў на прафесійную пенсію, то страта вызначаецца ў 5 % (па тугавухасці), а вось хранічны бранхіт цяпер не ўлічваецца.

Наталля Качанава паабяцала асабіста вывучыць сітуацыю і заўважыла:

— Мы не будзем нікому дасылаць лісты, самі будзем разбірацца, падымем усе пастановы і вывучым іх. Я бачу, што нестыкоўкі ёсць. Чаму пастановы ўплываюць на людзей, у якіх ужо ўсё вызначана, якія ўжо атрымліваюць свае налічэнні, навошта мы іх чапаем?

Спікер Савета Рэспублікі падкрэсліла, што афіцыйныя адказы часта дасылаюць з вялікімі аб'ёмамі інфармацыі, а трэба, каб быў дакладны адказ на дакладаное пытанне чалавека.

Ірына з Баранавіч ужо дзесяць гадоў змагаецца з наступствамі вытворчай чэрапна-мазгавой траўмы сына, якую ён атрымаў у 25 гадоў. Маладому чалавеку давалі вельмі мала шанцаў, ён быў у коме. Спачатку паставілі II нерабочую групу інваліднасці, цяпер яна ў яго III, і ён спрабуе працаваць, аднак хутка стамляецца, пачынаюцца болі, ён штомесяц на бальнічным.

— Раннюю рэабілітацыю сын атрымаў у Доме міласэрнасці, яе аплаціла фірма, дзе ён працаваў. Потым мы раз плацілі самі, але гэта было на той час звыш 15 мільёнаў. Цяпер штогод мы змагаемся за жыццё і хацелі б ізноў трапіць у Дом міласэрнасці, аднак гэта вельмі дорага (цяпер 3000 рублёў). А калі я да вас запісалася на прыём, мне адразу пазванілі і прапанавалі ехаць на рэабілітацыю ў Аксакаўшчыну, аднак нам тыя ўмовы не падыходзяць для позняй рэабілітацыі. Тым больш што нас адтуль адправілі і сказалі, што для нас там няма ўмоў, — падзялілася жанчына.

(Заканчэнне на 8-й стар.)

РЭАБІЛІТАЦЫЯ, МАЁМАСЦЬ, ПРЫВАТНЫ БІЗНЕС

(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)

Наталля Качанава заўважыла, што спецыялісты высветляць, дзе, згодна з медыцынскімі паказаннямі сына жанчыны, яму можна прапанаваць найлепшую рэабілітацыю, і дадала, што ў Аксакаўшчыне праводзяць рэабілітацыю на ўсіх стадыях:

— Мы сур'ёзна займаемся аховай здароўя, у тым ліку і рэабілітацыяй, праходзіць поўны маніторынг сістэмы аховы здароўя. На дадзеным этапе я б вам парэкамендавала пагадзіцца на рэабілітацыю ў Аксакаўшчыне, а мы паглядзім і пракантралюем, што яму прызначаць: працэдуры, прэпараты. Калі такім людзям патрэбна рэабілітацыя, то варта вызначыць і патрэбную перыядычнасць у ёй.

Захоп уласнасці і дзелавая рэпутацыя

Са скаргай на незаконны захоп ва ўласнасць шляхам падробкі подпісаў прадпрыемства «Агрэст» прыйшла да сенатара пенсіянерка Галіна. Такіх былых уладальнікаў маёмасці, якую яны прыватызавалі ў 1995-м і ўкладвалі свае грошы ў яе пакупку, восем чалавек, усе на пенсіі. Пасля да іх у давер увайшлі два чалавекі, якія сталі сузаснавальнікамі. Потым новыя саўладальнікі сталі здаваць будынак у арэнду.

— За ўвесь час мы не атрымалі ні капейкі (а яны атрымалі за пяць гадоў 300 тысяч еўра), не праводзяцца сходы, яны не адказваюць на нашы лісты. З 2010 года мы звярталіся ў пракуратуру, міліцыю, нам усе раяць ісці ў суд, — расказала Галіна. — Летась мы даслалі ліст у генпракуратуру, а яна пераслала яго ў гарадскую, пасля ў раённую (Партызанскага раёна. — **Рэд.**), адкуль адказалі, што наш зварот ананімны і разгляду не падлягае.

Наталля Качанава даручыла Надзеі Лазарэвіч, першаму намесніку старшыні Мінгарвыканкама, каб яна разам з Мінюстам разабралася, што гэта за ўласнік будынка, тым больш што ён там не адзін уласнік:

— Хай яна сустрэнецца з ім асабіста, разбярэцца, чаму так да людзей ставяцца, што яны вымушаны судзіцца, што ён у будынку робіць. Ну няхай бы выкупіў долю і займаўся сабе далей. Ён павінен выплаціць грошы па сваіх абавязацельствах. Трэба ўвогуле паглядзець на кожны будынак Мінска. Хто ўладальнік, што там робіць, каб не было вось так. І яшчэ трэба думаць, каму здаваць будынкі ў арэнду, каб гэта не перашкаджала суседзям у жылых дамах.

Наступны заяўнік, які ў адной асобе прадстаўляе і індывідуальнага прадпрымальніка, і ўласніка гандлёвага прадпрыемства, скардзіцца на налічаныя яму 500 тысяч падаткаў. Генадзь са Жлобіна як індывідуальны прадпрымальнік набыў будынак, дзе зрабіў рамонт, а ў 2005-м стварыў гандлёвае прадпрыемства, якому ён здаваў гэты будынак, зарэгістраваны на ІП (на яго. — **Рэд.**). Прадпрыемства з часам пашыралася і ў 2018-м набыло з аукцыёну яшчэ адзін будынак, які зарэгістравалі на прадпрыемства, за кошт якога зрабілі і рамонт. Цяпер на прадпрыемстве працуе 280 чалавек, дзе вырабляюць і прадаюць хлебабулачныя вырабы (каля 30 тон) і кулінарыю (55 тон).

— Я здаваў памяшканне ў арэнду прадпрыемству (свайму ж) пяць гадоў бязвыплатна. Калі справы ў прадпрыемства пайшлі, пачаў браць арэндную плату (удвая ніжэйшую за рыначную). У 2020 годзе інспекцыя па падатках і зборах запатрабавала дакументы аб узаемадзеянні ІП з прадпрыемствам. Праз два-тры тыдні

я пазваніў, мне сказалі, што ўсё нармальна. Даведку не далі, бо ўсё ў парадку было. Летась Дэпартамент фінансавых расследаванняў мяне зноў папрасіў прадставіць дакументы аб узаемаразліках, і там сказалі, што не было ў мяне ніякай праверкі ў 2020-м. Мне налічылі 500 тысяч падаткаў за тое, што ІП (я) здаваў памяшканне ў арэнду ўзаемазалежнай асобе (прадпрыемству) без аплаты. Я аплацію гэтыя грошы, бо сказалі, што замарозяць рахункі, а мне дзелавая рэпутацыя даражэйшая, аднак я напісаў, што з гэтым не згодны. Я неаднаразова прасіў патлумачыць, як нам працаваць далей, каб было правільна, і што рабіць. Дайшла справа і да суда, і падатковая цяпер прызнае, што ў 2020-м яны рабілі камеральную праверку.

Прадпрымальніку ставяць у віну, што і ІП, і прадпрыемства зарэгістраваны па адным адрасе (хатнім Генадзя), што ён недастаткова добра развіваў уласнае прадпрыемства, знімаў арэндную стаўку, здымаў 70 % здабытку, які ён забіраў як ІП, а яму кажуць, што гэта абнаяўліванне сродкаў. Усе абвінавачванні разглядаюцца ў комплексе, хаця прамых забарон законам і парушэнняў яго няма.

— Вы наўмысна зрабілі так, каб у прадпрыемства была павялічана затратная частка і яно магло плаціць менш падаткаў на прыбытак і падаходных падаткаў. З 2010 года прадпрыемства не выплачвае дывідэнды. Навошта плаціць, калі можна знізіць арэндную плату і тут жа зняць грошы на ўласнае карыстанне. Аднак калі б гэта было нейкай іншай кампаніі, а не самому сабе... Мы адштурхоўваемся ад тых фактаў, якія былі выяўлены ў ходзе праверкі. Даваць іншую кваліфікацыю вынікам праверкі я не маю права, — патлумачыў **Уладзімір МУКВІЧ, намеснік міністра па падатках і зборах.**

Такое адчуванне, што хтосьці тут недагаворвае, заўважыла спікер Савета Рэспублікі і даручыла разабрацца ў пытанні Камітэту дзяржкантролю, бо тут шмат незразумелага:

— Прадпрыемства сябе зарэкамендавала, і чалавеку трэба разумець, што рабіць. ІП закрываць, ці што? Трэба патлумачыць, што забаронена законам, а што не. Ён правільна пытае, што ён парушыў, што супрацьзаконна. За нешта ж завялі на чалавека крымінальную справу. Мы зараз разглядаем змяненні законаў па пытаннях прадпрымальніцкай дзейнасці, дык давайце прапішам, што нельга быць у адной асобе і ІП, і прыватным прадпрыемствам. Каб не было такіх сітуацый, што чалавек, здаецца, усё робіць па законе, а праблемы ёсць. Трэба ўнесці ў заканадаўства змены і абазначыць, што нельга рабіць, — рэзюмавала Наталля Качанава.

Падатковыя органы, магчыма, павінны збіраць ІП і прыватныя прадпрыемствы і тлумачыць, як і што яны павінны рабіць, заўважыла яна.

Жыллё для дзядулі і аб'яднанне сям'і

На прыём да Наталлі Качанавай прыйшлі Ігнацій і Ганна з просьбай дапамагчы маладой сям'і аб'яднацца. Жонка працуе ўрачом у Вілейцы, а муж — у дарожна-будаўнічым упраўленні ў Віцебску, і ім прыходзіцца жыць паасобку, таму сужэнцы хочуць, каб жонку перараз меркавалі да мужа ў Віцебск.

— Я вам нічога не магу паабяцаць, тым больш што ў вас было мэтавае накіраванне, і гэта няправільна. Трэба падумаць, як зрабіць, каб і Вілейка не пацярпела, бо нам патрэбны там урачы-неўролагі, аднак і ў Віцебску яны патрэбны. Калі мы зможам знайсці нейкую адэкватную замену, магчыма, нехта захоча пераехаць працаваць у Мінскую вобласць, то можна будзе вырашыць праблему, адным словам, паспрабуем, — паабяцала Наталля Качанава.

Парламентарый дадала, што яна «за тое, каб у Віцебскай вобласці асядалі людзі, і трэба рабіць усё, каб там людзі заставаліся. На Міншчыне ў нас парадак».

Прыйшоў скардзіцца на адсутнасць жылля і 65-гадовы мужчына, які сцвярджае, што 30 гадоў абівае парогі ўстаноў, каб атрымаць сваё жыллё.

— 10 ліпеня 2020-га мужчына зарэгістраваны па дагаворы найму ў доме ў Смалявічах. 4 верасня 2020-га ён прыняты на ўлік асоб, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, у Смалявіцкім райвыканкаме. Быў тады 1600-м у спісе. У асобным спісе на права атрымання сацыяльнага жылля мужчына быў 200-м (цяпер ён у гэтым спісе 164-ы). І яшчэ ён як інвалід II непрацоўнай групы ўнесены (па асобнай падгрупе) за нумарам 6. Аднак адпаведна з артыкулам 98 Жыллёвага кодэксу ён не мае пераваг і знаходзіцца ў чарзе, як і астатнія, — пракаментаваў скаргу **Віктар РАГУСКІ, намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама**, які дадаў, што з улікам хуткасці ўзвядзення жылля ў Смалявіцкім раёне для тых, хто мае ў ім патрэбу (сацыяльнае жыллё атрымаў 41 чалавек за два гады), чарга да яго дойдзе ў лепшым выпадку гады праз чатыры.

— Пераскочыць чаргу ніхто не мае права. Я не магу вам без чаргі выдзеліць жыллё, — заўважыла Наталля Качанава і прапанавала яму паспрабаваць варыянт арэнднага жылля па чарзе. — Сацыяльнае і арэнднае жыллё сёння не прыватызуецца і не прадаецца, таму раю вам паспрабаваць арэнднае жыллё. Яго вы можаце атрымаць ужо зараз, а сацыяльнае — праз чатыры гады.

Тут жа падлічылі, што мужчыну гэта абыдзецца ў 120—150 рублёў у месяц плюс налічэнні за камунальныя паслугі (50 %, бо ён інвалід). Са сваёй пенсіі ў 700 рублёў мужчына гэта пацягне, заўважыў ён і адразу пагадзіўся на прапанову сенатара, якая паабяцала, што будзе трымаць на кантролі пытанне атрымання мужчынам жылля.

Ірына СІДАРОК.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

Што тармозіць будаўніцтва стадыёна ў Мастах

Гродзенскія дэпутаты разгледзелі ход рэалізацыі праграмы «Фізкультура і спорт»

Пытанні развіцця рэгіянальнага комплексу мерапрыемстваў Дзяржаўнай праграмы па развіцці фізічнай культуры і спорту на 2021—2025 гады сталі тэмай чарговага пасяджэння прэзідыума Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, якое адбылося ў горадзе Масты. Дэпутаты наведалі шэраг аб'ектаў, у тым ліку праблемных.

Падчас адкрыцця пасяджэння старшыня абласнога Савета дэпутатаў Алена Пасюта акрэсліла важнасць заняткаў масавай фізічнай культурай і спортам. На яе думку, работнікі гэтай сферы павінны больш актыўна прыцягваць людзей да мерапрыемстваў такога роду, а таксама рыхтаваць спартсменаў для высокіх дасягненняў. Тым больш што гэтаму кірунку ўдзяляецца вялікая ўвага з боку кіраўніка дзяржавы і органаў дзяржаўнай улады. Ствараецца адпаведная спартыўная інфраструктура.

У гэтым дэпутаты змаглі ўпэўніцца пры наведванні шэрагу дзеючых аб'ектаў раённага цэнтра. Такім чынам, адбылося знаёмства з работай дзіцяча-юнацкай спартыўнай школы, фізкультурна-аздараўленчага комплексу «Прынеманскі», фізкультурна-спартыўнага клуба. Кіраўнікі спартыўных аб'ектаў расказалі аб дасягненнях сваіх выхаванцаў, перамогах, атрыманых імі на рознага роду спаборніцтвах.

А вось рэканструкцыя гарадскога стадыёна зацягнулася. Прычына — недахоп кадраў. У сувязі з гэтым ход будаўнічых работ адстае ад графіка. Пры гэтым і фінансаванне, і жаданне давесці аб'ект да лагічнага завяршэння прысутнічаюць. А вось з будаўнікамі пакуль замінка. Між тым гэта пытанне будзе вырашацца, запэўнілі ў адміністрацыі раёна. Праблемным застаецца пытанне набыцця новага інвентару ў трэнажорную залу. Умовы правядзення тэндара не заўсёды дазваляюць набыць якаснае абсталяванне для заняткаў цяжкай атлетыкай. Гэта стрымлівае развіццё тэхнічнай базы трэнажоркі.

Між тым дэпутаты, што называецца, свежым вокам ацанілі мясцовы ФАК. Да зрэнгу існуючых працэдур яны параілі дадаць заняткі па фітнесу, трэнажоры для жанчын, дадатковыя аздараўленчыя працэдуры, напрыклад, кіслародныя кактэйлі, а магчыма, і лячэбныя ванны.

Як паведаміў у сваёй справаздачы перад дэпутатамі начальнік упраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама Максім Малахоўскі, дзяржаўная праграма ў частцы фізічнай культуры і спорту ў рэгіёне ў цэлым выконваецца. За год спартыўную падрыхтоўку прайшлі больш за 18 тысяч чалавек. За апошнія пяць гадоў пабудавана значная колькасць аб'ектаў спартыўнай інфраструктуры, праведзена звыш 1,5 тысячы спартыўных святаў і спаборніцтваў. Разам з тым былі вызначаны і недахопы. У прыватнасці, зроблены акцэнт на недасканалую падрыхтоўку спартсменаў, іх колькасць, выкананне спартыўных разрадаў.

Фота mosty-zara.by

Што датычыцца масавага спорту, дэпутаты зацікавіліся вопытам работы Гудзевіцкага сельскага Савета. Старшыня сельвыканкама Вікторыя Палойка расказала аб мясцовым вопыце прыцягвання насельніцтва ў масавыя заняткі фізічнай культурай, у аснове якіх ляжаць сямейныя спаборніцтвы і актыўны адпачынак.

На думку старшыні аблсавета Алены Пасюты, добрым штуршком для развіцця гэтага кірунку дзейнасці мясцовых органаў улады можа стаць прыклад кіраўнікоў рознага ўзроўню, якія не павінны заставацца ўбаку ад правядзення спартыўных мерапрыемстваў. У гэтым сэнсе паказальнай можа стаць пазіцыя кіраўніка Гродзенскай вобласці Уладзіміра Караніка і памочніка Прэзідэнта — інспектара па Гродзенскай вобласці Юрыя Караева, якія не толькі з'яўляюцца актыўнымі балельшчыкамі, але і заўзятымі спартсменамі. Вакол іх стварылася каманда, якая прымае ўдзел у спаборніцтвах па футболе і валейболе.

Маргарыта УШКЕВІЧ.

БАБРУЙСКІЯ ДЭПУТАТЫ ПАДЗЯЛІЛІСЯ ВОПЫТАМ

З практыкі адной выязной сесіі Магілёўскага аблсавета

Гэтым разам месцам пераймання вопыту быў абраны Бабруйск — сёмы па колькасці насельніцтва горад у краіне. Праграма была досыць шчыльная, на парадку дня — шэраг пытанняў. Асноўныя — стан выканання на Магілёўшчыне пяцігадовай — да 2025-га — дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка», а таксама вопыт работы Бабруйскага гарсавета па павышэнні ролі органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў вырашэнні пытанняў жыццезабеспячэння насельніцтва.

З выездам на месца

У Бабруйску да ўдзельнікаў сесіі (у тым ліку дэпутатаў парламента і парламентарыяў) далучыліся старшыня Бабруйскага гарсавета дэпутатаў Міхаіл Жалудоў і першы намеснік старшыні Бабруйскага гарвыканкама Дзмітрый Максіменка. Удзельнікам было прапанавана падзяліцца на дзве групы, каб з выездам на месца больш дэталёва пазнаёміцца з работай асобных прадпрыемстваў і ўстаноў. Пакуль першыя знаёміліся з асаблівасцямі адукацыйнага працэсу на прыкладзе сярэдняй школы № 35 г. Бабруйска імя П. І. Батава і вывучалі магчымасці ААТ «Кіруючая кампанія холдынга «БабруйскАграМаш», другія (у тым ліку і карэспандэнт «МС») наведалі дзіцячы садок № 84 Бабруйска і мэблевую вытворчасць «ФанДОК».

Дашкольная дзіцячая ўстанова знаходзіцца ў самым маладым мікраёне горада «Маладзёжны». Ён забудоўваўся ў 70—80-я гады мінулага стагоддзя. У назвах вуліц увекавечаны імёны гераічных ваенных дзеячаў, лёс якіх звязаны з горадам, — Барыса Коўзана, Сяргея Сікорскага, генерала Паўла Батава, які вызваляў Бабруйск у 1944-м.

Свае дзверы дзіцячы садок расчыніў тры гады таму. Будаваўся па дзяржаўнай інвестпраграме Бабруйскім заводам КПД. На плошчы болей чым 2,3 тысячы квадратных метраў размясціліся ўсе неабходныя для развіцця і заняткаў дашкалят памяшканні і нават басейн. Садок наведвае 240 дзяцей, якія размеркаваныя па 13 узроставых групах. Адна з іх — спецыялізаваная, для выхаванцаў з цяжкімі парушэннямі маўлення.

Прыярытэтны кірунак, які пазіцыянуе ўстанова, — фарміраванне асноў бяспечнай жыццядзейнасці. Пры падтрымцы Бабруйскага гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях тут абсталяваны спецыяльны пакой бяспекі. Яшчэ адзін кірунак, які распаўсюджваецца ў тым ліку і на бацькоў выхаванцаў, — патрыятычнае і грамадзянскае выхаванне. Дарослыя дапамагаюць ў падрыхтоўцы да свят, удзельнічаюць разам з дзецьмі ва ўрачыстых шэсцях, выставах.

Загадчыца дзіцячага садка Таццяна АНЦЮШЭНЯ разам са сваімі калегамі правяла экскурсію па садку і паказала, наколькі творчая праводзіцца тут работа. Вельмі кранула, як маленькія дзеці ў нацыянальных касцюмах сур'ёзна і артыстычна спявалі дарослым на роднай мове. І падобраму пазайздросціла малым, якія пялёсткаліся ў цёплым, вельмі сучасным і прыгожым басейне.

— У праграме будаўніцтва дзіцячых дашкольных устаноў гэты сад тыповы, — адзначыў **дэпутат аблсавета, старшыня Магілёўскай абласной арганізацыі ветэранаў Анатоль ГЛАЗ**. — Ён прадугледжвае наяўнасць усіх тых атрыбутаў, якія павінны забяспечваць паўнавартаснае выхаванне дзіцяці. Цудоўны калектыў, добра працуе. Для дзетак, якія маюць патрэбу ў індывідуальным навучанні, ёсць адпаведныя спецыялісты. Кожнае дзіця абыходзіцца бюджэту ў 4900 рублёў за год. А бацькоўская даплата складае 103 рублі ў месяц — за харчаванне, калі шматдзетная сям'я — напалову танней, а калі дзіця-інвалід, то наогул бясплатна. Трэба, каб бацькі памяталі, што наша дзяржава сацыяльна-арыентаваная, і сумленна працавалі на яе карысць.

Дарэчы, яшчэ ў садку ўсе звярнулі ўвагу, якая зручная і прыгожая тут мэбля. Высветлілася, што свайго ж вытворцы — бабруйскага прадпрыемства «ФанДОК».

Падчас візіту на яго можна было ўбачыць і іншыя ўзоры мэблі, прычым на любы густ. На жаль, санкцыі сур'ёзна паўплывалі на, лічы, горадаўтваральнае прадпрыемства Бабруйска. Яно было амаль цалкам завязана на экспарце мэблі ў цяпер не дружалюбныя краіны. Некаторыя з іх і зараз невялікімі партыямі заказваюць тут мэблю, але гэта кропля ў моры. Прадпрыемства наладжвае сувязі з усходнімі партнёрамі, павялічваюцца адгрузкі прадукцыі ў Кітай, але вельмі запаволена выходзіць з крызісу. Тым не менш прагнозы даволі аптымістычныя, і паказчыкі пакрыху, але ж паляпшаюцца. Удзельнікі сесіі наведалі таксама самы прыбытковы ўчастак на сёння гэтага вытворцы — фанерны завод. Сярэдняя зарплата на сёння тут , па словах яго кіраўніка, каля 1300 рублёў.

Сёння на «ФанДОКу» працуе 6800 чалавек. Прадпрыемства працуе разам з лесатэхнічным каледжам, які забяспечвае яго кадрамі. Сёння гэта філіял Беларускага тэхналагічнага ўніверсітэта.

Генеральны дырэктар ААТ «ФанДОК» Андрэй ПАРЦЯНКОЎ перакананы, што візіт дэпутатаў і парламентарыяў вельмі карысны для прадпрыемства. Нехта па-новаму адкрыў «ФанДОК», ацаніў новую лінейку яго мэблі.

— Еўропа закрыла для нас рынкі, мы пераарыентаваліся на іншыя, але яны менш маржынальныя, — канстатуе генеральны дырэктар. — Патрэбны час, перабудова, у тым ліку і па асартыменце. На жаль, працэс не вельмі хуткі.

Старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, будаўніцтве, транспарце, сувязі, жыллёва-камунальнай і дарожнай гаспадаркі Магілёўскага аблсавета, кіраўнік адміністрацыі СЭЗ «Магілёў» Андрэй ЯРЦАЎ рэзюмуе: прадпрыемства перажывае наступствы сектаральных санкцый.

— У краіне прымаюцца ўсе магчымыя меры, каб нівеліраваць сітуацыю ў галіне дрэваапрацоўкі, — адзначыў ён. — Ідзе барацьба за новыя рынкі збыту. Гэта работа і дзяржавы праз пасольствы тых краін, праз афіцыйныя візіты, і непасрэдна канцэрна «Беллеспаперапрам», у які ўваходзіць прадпрыемства. У Расіі празмернасць драўніны, але трэба шукаць нішу, больш танныя варыянты сыравіны.

Лепш адзін раз убачыць...

Карэспандэнт «МС» пацікавілася ва ўдзельнікаў, чым асабіста ім было карысна знаёмства з патэнцыялам Бабруйска.

Старшыням Крычаўскага і Мсціслаўскага райсаветаў Ірыне ПРУДНІКАВАЙ і **Алене КЛЕЯНКОВАЙ** было цікава даведацца, як працуе бабруйская моладзь і ўзаемадзейнічае з мясцовай уладай. Уразіла прадпрыемства «БабруйскАграМаш», на якім атрымалася пабываць упершыню.

— Вельмі добрая практыка — паехаць і паглядзець, што робіцца ў раёнах, — перакананыя яны. — Можна сто разоў пачуць, але лепш адзін раз убачыць. Каб нешта прымяніць на свой раён. Захапіў узровень работы з моладдзю. На тым жа «БабруйскАграМашы» замацаванасць кадраў у 2019 годзе была ўсяго 18 %, цяпер — 40! Спрацавала тое, што была ўведзена дадатковая стаўка — спецыяліст па рабоце з моладдзю. Наогул, вопыт добры, трэба акцэнт рабіць на працоўнай моладзі. Каб яе прыцягнуць, варта стварыць неабходныя ўмовы. Мы і ў сябе ў раёнах практыкуем выязныя мерапрыемствы. Часам, нават на месцах адкрываеш для сябе шмат яшчэ няўлічаных славутасцяў і цікавых людзей.

Старшыня Хоцімскага райсавета Яўген НІКАЛАЕНКА таксама адзначыў дзейсную работу з моладдзю.

— Мяне вельмі ўразіла моладзь, як яны захоўваюць памяць пра Вялікую Айчынную вайну, — адзначыў ён. — Я вельмі рады за гэтых дзяцей, яны — наша надзейная будучыня. Работа па выхаванні моладзі ў Бабруйску праводзіцца сістэмная, мэтанакіраваная.

— Мы аб'ездзілі практычна кожны раён, і можна смела казаць: якая прыгожая ў нас краіна, — падзяліўся **член Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, галоўны ўрач Магілёўскай абласной дзіцячай бальніцы Ігар КАСКО**. — Бабруйск — наогул выключны горад. Мы наведалі шыкоўную вельмі сучасную школу. Я вучыўся ў звычайнай, а гэта проста фантастыка. Афармленне, напаўненне, — сапраўды палацава-паркавы ансамбль. Знаходжанне ў такім прыгожым месцы вымушае і весці сябе высокакультурна. «БабруйскАграМаш» уразіў сваёй магутнасцю і аб'ёмам. На заводзе практычна ўсе брэндзіравана. Асабіста

мяне як урача парадавала, што ў месцах для курэння — інфармацыя, што гэта вялікая шкода арганізму.

— Спадабалася адладжаная сістэма ідэалагічнай работы ў сярэдняй школе № 35 імя П. І.Батава, — рэзюмаваў **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці, рэктар Акадэміі паслядыпломнай адукацыі Алег ДЗЯЧЭНКА**. — Выдатная музейная экспазіцыя, прысвечаная гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, шырокае выкарыстанне беларускай арнаментальстыкі пры афармленні холаў школы, папулярызацыя класікаў беларускай літаратуры — гэта перш-шае, што кідаецца ў вочы кожнаму, хто пераступае парог школы, якая была ўведзена ў эксплуатацыю ў 2021 годзе. Светлыя і ўтульныя класы, сучасныя спартзала, трэнажорка, басейн, бібліятэка, кабінет ратавальнікаў, сталовая з кардынальна абноўленым меню — у школе створаны вельмі камфортныя ўмовы для навучання, выхавання, адпачынку і ўмацавання здароўя дзяцей.

Разам з жыхарамі

Падчас пленарнага пасяджэння разгледжаны ход рэалізацыі дзяржпраграмы «Адукацыя і маладзёжная палітыка» з улікам досведу, атрыманага падчас наведвання аб'ектаў сферы адукацыі і прамысловасці. На прыкладзе Бабруйска вывучана практыка работы органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання. У прыватнасці, якую ролю яны іграюць у прыцягненні насельніцтва для стварэння камфортнага асяроддзя пражывання і выхавання рупліўцаў. Калегіяльна яны дзейнічаюць у рамках ЖЭУ. У Бабруйску іх налічваецца 13. Тут працуе 81 чалавек — дэпутаты, работнікі ЖКГ, адукацыі, міліцыі, жыхары. Сюды сцякаецца ўся карысная інфармацыя, сістэматызуецца, кантралюецца. Актывісты вядуць кантроль за ўборкай прыдамавых тэрыторый, захавальнасці жылога фонду ў належным стане, прыцягваюць грамадзян да суботнікаў, заахвочваюць гараджан удзельнічаць у конкурсах і падключацца да самафінансавання цікавых для іх праектаў з удзелам абласной Асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў: добраўпарадкаванне гульнявых і спартыўных пляцовак, зон адпачынку. Разам абмяркоўваюцца грамадзянскія ініцыятывы, найлепшыя з якіх фінансуюцца. Расказаў пра дзейнасць органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання **старшыня Бабруйскага гарсавета Міхаіл Жалудоў.**

Старшыня Магілёўскага аблсавета Ірына РАІНЧЫК назвала выязную сесію практыкаарыентаванай.

— Мы наведалі бабруйскія прадпрыемствы і сацыяльныя ўстановы з мэтай пазнаёміцца з ходам сацыяльна-эканамічнага развіцця Бабруйска, сферы адукацыі. Сістэма адукацыі ў Магілёўскай вобласці функцыянуе стабільна, рэалізоўвае права кожнага дзіця на атрыманне на годным узроўні якаснай адукацыі, духоўнага і фізічнага развіцця. Дзяржава накіроўвае значныя сродкі на стварэнне камфортных умоў для арганізацыі вучобы і вольнага часу дашкольнікаў і школьнікаў. Толькі сёлета для правядзення капітальных і бягучых рамонтаў з абласнога бюджэту было выдзелена каля 68 мільёнаў рублёў. Будуецца два новыя дзіцячыя садкі ў Магілёве і Бабруйску, дзве школы — у Магілёве і Асіповічах, завершана рэканструкцыя дзіцячага садка ў аграгарадку Вейна Магілёўскага раёна, уведзены ў эксплуатацыю басейн «Каскад» у гарадскім пасёлку Хоцімск, адкрыты дом сямейнага тыпу ў Бабруйску. На правядзенне работ па рамонце фізкультурна-спартыўных пляцовак устаноў адукацыі накіравана 850 тысяч рублёў. На набыццё высокатэхналагічнага халадзільнага абсталявання — болей чым адзін мільён. Хочацца звярнуць увагу яшчэ на такі важны момант. З улікам заўваг Прэзідэнта мы павінны забяспечыць ва ўстановах адукацыі парадак і дысцыпліну. Школа закладвае падмурак не толькі будучага грамадзяніна, але і патрыёта сваёй краіны. Паўсюль павінен быць наведзены парадак у памяшканнях і на тэрыторыі. Усе работы трэба праводзіць з удзелам дзяцей. Выхоўваючы дзяцей працай, мы закладваем у іх беражлівыя адносіны да школы, імкненне прымнажаць каштоўнасці і традыцыі свайго народа. Асобная тэма — арганізацыя харчавання ў школах. У кіраўніка ўстановы павінна быць на штодзённым кантролі якасць харчавання. І трэба не забываць, што якасць навучання — гэта не толькі абноўленае абсталяванне, праграмы і падручнікі, вынікі цэнтралізаванага тэсціравання, але і паспяхова ўладкаваны чалавек, яго канкурэнтаздольнасць у цяперашнім свеце і цвёрдая грамадзянская пазіцыя. Час патрабуе новых падыходаў, падрыхтоўкі кадраў з улікам неабходных для эканомікі прафесійных кампетэнцый. Паспяховае вырашэнне кадравых пытанняў непарыўна звязана з актыўным уцягваннем у працэс абучэння арганізацый — заказчыкаў кадраў. Пры наведванні прадпрыемстваў у Бабруйску мы змаглі ўбачыць, як гэта функцыянуе.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.
Бабруйск.

ТУРЫЗМ, АПК, РАЗВІЦЦЁ ТЭРЫТОРЫЙ...

Якія кірункі дзейнасці вызначылі парламентарыі Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей на форуме малых гарадоў

Сустрэча насіла фармат з'езда і праводзілася другі раз. Першы з'езд адбыўся летась у гарадку Вача Ніжагародскай вобласці, гэтым разам гасцей прымала Зэльва. За некалькі дзён прадстаўнікі расійскай дэлегацыі праехалі па некалькіх маршрутах, пабывалі на прадпрыемствах, у навучальных, культурных установах. Вынікам з'езда стала падпісанне шасці пагадненняў аб далейшым супрацоўніцтве паміж раёнамі Гродзенскай і Ніжагародскай абласцей.

Падобны форум праходзіць у нашай краіне ўпершыню. З беларускага боку яго арганізатарам выступіў партнёрскі альянс раёнаў Гродзенскай вобласці па ўстойлівым развіцці. Створаны ён усяго два гады таму для супрацоўніцтва з Расіяй, у прыватнасці Ніжагародскай вобласцю, якая ўяўляе для гродзенцаў вялікі інтарэс.

Як было заяўлена падчас форуму, развіццё малых гарадоў — стратэгічная задача, якой удзяляецца асаблівая ўвага як у Беларусі, так і Расіі. У кожнага боку — свае ўнікальныя напрацоўкі, якімі можна абменьвацца. Менавіта на гэта і скіраваны такія з'езды. А сустрэчы дазваляюць знаходзіць шмат новых кантактаў для далейшага ўзаемадзеяння.

Старт, узяты ў мінулым годзе на расійскай зямлі, аказаўся даволі ўдалы. Адразу была выпрацавана праграма асноўных кірункаў сумеснай дзейнасці, наладжаны кантакт з суб'ектамі гаспадарання. Практыка паказала перспектыўнасць альянсу малых гарадоў Гродзеншчыны і расійскага рэгіёна. Таму новая сустрэча на беларускай зямлі значна пашырыла рамкі ўзаемадзеяння. Бакі засяродзілі ўвагу на чатырох тэмах: гэта работа з моладдзю, развіццё АПК, турызм і дзейнасць органаў мясцовага самакіравання.

Кожны трэці трактар — беларускі

Па словах **першага намесніка старшыні Заканадаўчага сходу Ніжагародскай вобласці Вольгі ШЧАЦІНІНАЙ**, сёння важна ўдзяляць увагу патрыятычнаму выхаванню дзяцей і моладзі. Госці сустракаліся з беларускімі вучнямі, студэнтамі, маладымі спецыялістамі. Яны бачылі, як беларуская моладзь ставіцца да развіцця сваёй малой радзімы, паважае яе традыцыі.

— Мы бачым цікавы вопыт двухпалатнага маладзёжнага парламента. Ён новы для нас, і мы будзем яго пераймаць, у сваю чаргу, беларускіх парламентарыяў зацікавіў вопыт надання маладзёжнаму парламенту Ніжагародскай вобласці права заканадаўчай ініцыятывы, — расказала Вольга Шчацініна.

Стратэгічным кірункам можа стаць супрацоўніцтва ў сферы АПК. У прыватнасці, будаўніцтва малочнатаварных комплексаў, кормавытворчасць, а таксама племянная і селекцыйная работа.

— Нас заўсёды прыцягваў вопыт работы беларускіх аграрыяў. І тут ёсць чаму павучыцца, — зазначыла Вольга Шчацініна. — На будучыню мы вызначылі супрацоўніцтва па ўкараненні ў нас селекцыйных дасягненняў Беларусі, у тым ліку вырошчвання пладова-ягодных культур. Таксама абмеркавалі стварэнне ў расійскім рэгіёне цэнтраў па капітальным рамонце сельгастэхнікі. Кожны трэці трактар, які працуе на тэрыторыі Ніжагародскай вобласці, — гэта трактар беларускай вытворчасці. Нам цікава пашыраць супрацоўніцтва і з будаўнічымі кампаніямі Гродзенскай вобласці, сумесна будаваць сацыяльныя аб'екты, абменьвацца вопытам паміж прадпрыемствамі харчовай і перапрацоўчай галіны.

Ад хахламы да пустых будынкаў

Што датычыцца культурнай сферы, ёсць намер у будучыні правесці фестываль тэатраў малых гарадоў з выдзяленнем расійскага гранта. Не застанецца па-за ўвагай і рамесніцкая дзейнасць. Па словах гасцей, Ніжагародская вобласць — сталіца народных промыслаў Расійскай Федэрацыі: тут і хахлама, і казлоўская філігрань. На Гродзеншчыне брэндам стала саломапляценне, кераміка. Гэта дадатковы стымул для развіцця рэгіёнаў.

Расіяне зацікавіліся санаторна-курортным турызмам на Гродзеншчыне, а таксама падзялілі сваім вопытам турыстычнай дзейнасці, якая можа стаць цікавай для беларусаў.

Расійскія парламентарыі звярнулі ўвагу і на работу мясцовай улады з безгаспадарчымі, пустымі дамамі. Па словах гасцей, у гродзенцаў добраўпарадкаваны тэрыторыі. У сувязі з гэтым яны выказалі інтарэс да нарматыўных актаў, якія дазваляюць дабівацца такога парадку населеных пунктаў.

У гэтым плане даволі паказальным з'яўляецца Зэльва. Невялікі гарадскі пасёлак можна назваць прыкладам таго, як можна захоўваць традыцыі і не забываць аб перспектывах развіцця. У раёне праводзяцца розныя мерапрыемствы па добраўпарадкаванні тэрыторыі.

Да рэалізацыі ініцыятыў падключаюцца і жыхары раёна.

— У нас істотны вопыт удзелу ў рознай праектнай дзейнасці, — расказаў **старшыня Сынкавіцкага сельвыканкама Зэльвенскага раёна Пётр ТАЛАЙ**. — Напрыклад, у рамках праграмы ЕС ПРААН была рэалізавана мясцовая ініцыятыва па паляпшэнні інфраструктуры ў Сынкавічах, што садзейнічала турыстычнай прывабнасці вёскі, знакамітасць якой стварае старажытны храм — крэпасць XV стагоддзя.

Таксама ў Зэльвенскім раёне падтрымліваюць і ініцыіруюць стварэнне невялікіх прадпрыемстваў, якія дазваляюць забяспечыць насельніцтва працоўнымі месцамі, ствараюць умовы для работы моладзі на сваёй зямлі. Галоўная задача малых населеных пунктаў — развівацца такім чынам, каб захаваць і ўзровень насельніцтва, і вытворчасць. І тут важным стымулам якраз і павінна стаць узаемнае супрацоўніцтва з расійскім рэгіёнам. Дарэчы, у Зэльвенскім раёне работа ў гэтым кірунку вядзецца даволі актыўна. На з'ездзе было заключана пагадненне з ніжагародскім гарадком Вача. Па словах **старшыні Зэльвенскага райвыканкама Дзяніса АЛЬШЭЎСКАГА**, чакаецца супрацоўніцтва ў розных кірунках.

— Мы крыху ацанілі патэнцыял нашых будучых партнёраў. Гэта таксама раён невялікі, асаблівай прамысловасці няма, будзем напрацоўваць сувязі, магчыма, у сельскай гаспадарцы, перапрацоўцы. Таксама ў нас падпісаны дагаворы з Зеленаградскам Калінінградскай вобласці, горадам Ельскам, што на Браншчыне. Але з Ніжагародскай вобласцю супрацоўніцтва ідзе больш актыўна. Магчыма, таму, што ў Беларусі ёсць прадстаўніцтва расійскага рэгіёна, — акцэнтаваў сваю думку кіраўнік Зэльвенскага раёна.

Трэба сінхранізаваць заканадаўства

Па словах **старшыні Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алены ПАСЮТЫ**, гродзенцаў парадаваў інтарэс расіян да мясцовых прадпрыемстваў, у тым ліку да рэзідэнтаў СЭЗ «Гроднаінвест». Падпісанне пагадненняў павінна садзейнаць эканамічнаму вектару развіцця прамысловасці, перапрацоўкі. З прыцэлам на перспектыву адбылося наведванне прадпрыемства «Малочны Свет» у Гродне, «Праймілк» у Шчучыне, Слонімскага мясакамбіната.

